Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 СНЕЖНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 247 (28105) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Інтэрнэт-продаж пад наглядам

СТАР. 6

Пяць спосабаў павіншаваць блізкіх

СТАР. 8

Віцебскае стэрэа

СТАР. 13

НОВЫ ГОД У ВАШУ ХАТУ!

Фота БЕЛТА.

Якое ж свята без зялёнай прыгажуні? Многія з нас па-ранейшаму выбіраюць сапраўдныя зялёныя дрэўцы, бо і водар, і адчуванні Новага года тады таксама сапраўдныя, не штучныя. На гэтым тыдні па ўсёй краіне пачынаюць працаваць ёлачныя базары. Дрэўцы прывозяць са спецыяльных гадавальнікаў, якія ёсць у многіх лесагаспадарках. Ляснік Сяргей Макарэвіч, які працуе ў Брэсцкім лясгасе, з задавальненнем дорыць людзям прадчуванне свята, якое няпроста «злавіць» у гэтым па-вясноваму цёплым снежні.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:

«Шмат работы ў нас у сферы грамадскага харчавання. Пытанні выклікае даступнасць грамадскага харчавання — гэта тычыцца аб'ектаў як сацыяльнага (студэнцкія, заводскія сталовыя), так і высокага ўзроўню. Тут каласальнае поле для ўдасканалення. Таму трэба з улікам сусветнага прагрэсіўнага вопыту падысці да рэгулявання гэтай сферы дзейнасці. Грамадскае харчаванне павінна быць даступным».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.12.2015 г.

Долар ЗША	18376,00	▲
Еўра	19986,00	▲
Рас. руб.	257,96	▲
Укр. грыўня	780,71	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Сталічнае жыллё

ПРАПАНОВА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА, А КОШТ ЗНІЖАЕЦЦА

Спецыялісты адзначаюць, што зімой з'явіліся кватэры ў новабудоўлях, дзе квадратны метр каштуе ўжо да тысячы долараў

Увогуле, гэты год абяцае стаць не самым прыбытковым як для ўласнікаў свабодных метраў на другасным рынку жылля, так і для камерцыйных забудоўшчыкаў. У той час, калі на рынку працягваюць зніжацца кошты на нерухомасць, а таксама падае актыўнасць патэнцыяльных пакупнікоў, нешта сур'ёзнае зарабіць у гэтай сферы стала праблематычна. А вось палепшыць свае жыллёвыя ўмовы стала прасцей. Праўда, гэта пры наяўнасці дастатковых уласных сродкаў, бо вялікія працэнты па крэдытах не дазваляюць выкарыстоўваць іх напоўніцу.

Больш бюджэтныя праекты

Існуючая сітуацыя сёлета вымушае забудоўшчыкаў перайсці да больш істотных дзеянняў па карэкціроўцы як праектаў дамоў, так і маркетынгавай палітыкі ў адпаведнасці з новымі рэаліямі рынку, паведамляюць спецыялісты кансалдынгу і аналітыкі. Цяпер частка забудоўшчыкаў перагледзела праекты новых дамоў з мэтай зніжэння метражу кватэр, а некаторыя з арганізатараў камерцыйнага будаўніцтва пачалі прапаноўваць растэрміноўку плацяжоў на кватэры ўжо не толькі па аб'ектах, якія зараз будуюцца, але і ў дамах, здадзеных у эксплуатацыю.

Акрамя таго, сучасныя рэаліі рынку і пакупніцкага попыту такія, што ўжо мала прапанаваць кватэру з сучаснай планіроўкай у добрым доме, а неабходна забяспечыць добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол яго, наяўнасць машынамесцаў і сучасных дзіцячых пляцовак. «І, вядома ж, у перыяд нестабільнасці асаблівая ўвага надаецца рэпутацыі забудоўшчыка, яго здольнасці здаць дом у заяўленыя тэрміны», — лічаць эксперты рынку.

У плане цэнаўтварэння найбольш стабільнымі ў лістападзе аказаліся новабудоўлі класа «Стандарт». Варта адзначыць, што ён да гэтага часу застаецца самым шматлікім на рынку: новабудоўлі гэтага класа фарміруюць больш за палову аб'ёму рынку. Сярэдні кошт квадратнага метра ў ім у параўнанні з кастрычнікам, можна сказаць, застаўся без змен — ваганне склала толькі мінус 1% да ўзроўню 1275 долараў за «квадрат», у тым ліку ў аднапакаёвых кватэрах — 1320 долараў, двухпакаёвых — 1280 долараў, трохпакаёвых — 1240 долараў.

СТАР. 6

■ Рынак працы

КАНКУРЭНЦЫЯ, АДНАК...

БЕСПРАЦОЎНЫЯ САДЗЯЦЦА ЗА ПАРТЫ

Колькасць вакансій у Беларусі ў апошні час зніжаецца, што звязана з мадэрнізацыяй эканомікі, а таксама няпростым фінансавым становішчам некаторых прадпрыемстваў. Адпаведна, узмацняецца канкурэнцыя сярод прэтэндэнтаў на свабодныя рабочыя месцы. У гэтых умовах «пуцёўка» службы занятасці на прафесійную перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі, навучальныя курсы павышае шанц стаць больш запатрабаваным на рынку працы, і беспрацоўным не варта яго ігнараваць.

Напрыклад, у сярэднім на аднаго зарэгістраванага беспрацоўнага мінчаніна зараз прыпадае 1 вакансія (у студзені—верасні 2014 года было 11). Пры гэтым спецыялісты адзначаюць значнае скарачэнне прапаноў некваліфікаванай працы. Самую вялікую колькасць вакансій жыхарам сталіцы цяпер прапануюць арганізацыі сферы аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг (18%), будаўніцтва (16%), прамысловасці (15%), сферы нерухомасці (13%), арганізацый гандлю і адукацыі (па 10%).

З пачатку гэтага года ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва Мінска звярнуліся 19,9 тысячы чалавек, з іх 15,3 тысячы атрымалі статус беспрацоўнага. Рэгістрацыя беспрацоўных у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўзрасла ў 2 разы.

СТАР. 7



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

АДКБ СУПРАЦЬ ТЭРАРЫЗМУ

Учора на саміце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, які адбыўся ў Маскве, кіраўнікі дзяржаў-членаў прынялі сумесную заяву аб супрацьдзеянні міжнароднаму тэрарызму. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ у вузкім складзе, якое доўжылася больш за дзве гадзіны, і ў шырокім, калі далучыліся міністры замежных спраў і іншыя члены дэлегацый.

Прыярытэтнай задачай у барацьбе з тэрарызмам кіраўнікі дзяржаў — удзельнікі АДКБ назвалі рашучае спыненне дзейнасці групоўкі ІДІЛ. Яны таксама выступілі за фарміраванне шырокай кааліцыі на аснове палажэнняў Статута ААН, нормаў і прынцыпаў міжнароднага права без палітызацыі і папярэдніх умоў. Яны заклікалі ўсе дзяржавы няўхільна выконваць патрабаванні антытэрарыстычных рэзалюцый Савета Бяспекі і Генеральнай Асамблеі ААН.

«Канстатуем рост пагроз бяспекі ў Цэнтральнай Азіі, звязаных з павышэннем актыўнасці ІДІЛ, руху «Талібан», «Аль-Каіды» і іншых тэрарыстычных арганізацый на тэрыторыі Афганістана, што вядзе да ўсплёску напружанасці на паўднёвых рубяжах АДКБ, наўпрост пагражаючы дэстабілізацыі сітуацыі ў зоне яе адказнасці», — сказана ў сумеснай заяве прэзідэнтаў.

Лідары дзяржаў — членаў АДКБ лічаць, што падтрыманню стабільнасці на еўразійскай прасторы і ў свеце ўвогуле будуць спрыяць далейшае развіццё супрацоўніцтва ў рамках існуючых рэгіянальных структур і пашырэнне ўзаемадзеяння дзяржаў па пытаннях барацьбы з тэрарызмам.

Асобную ўвагу Савет калектыўнай бяспекі АДКБ надаў перакрыццю крыніц фінансавання тэрарызму. У сваёй заяве лідары краін-членаў таксама падтрымалі нарошчванне намаганняў міжнароднай супольнасці ў барацьбе з тэрарызмам у Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы пры паралельным прасоўванні мірнага палітычнага ўрэгулявання праз перамовы паміж урадам Сірыі і шырокім спектрам апазіцыі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

АРЫЕНЦІРЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора прыняў удзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, якое адбылося ў Маскве.

На пасяджэнні ВЕЭС былі падведзены вынікі першага года работы Еўразійскага эканамічнага саюза і вызначаны арыенціры для далейшага развіцця інтэграцыйнага аб'яднання, паведамляе БЕЛТА. Разглядаліся таксама пытанні развіцця нарматыўна-прававой базы, змены ў праграме паэтапнай лібералізацыі аўтамабільных перавозак, узаемадзеянне ЕАЭС з іншымі міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі аб'яднаннямі. Кіраўнікі дзяржаў-удзельніц зацвердзілі новы склад Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі і бюджэт саюза на наступны фінансавы год.

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка заявіў, у прыватнасці, што краіны ЕАЭС выпрацуюць меры абароны рынку пасля пачатку дзеяння зоны свабоднага гандлю паміж Украінай і ЕС. Адпаведны дагавор пачне дзейнічаць 1 студзеня 2016 года. Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, не толькі Расія, але і астатнія члены ЕАЭС дэманструюць заклапочанасць з гэтай нагоды.

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў выказаў падзяку Беларусі за працу ў якасці старшыні Еўразійскага эканамічнага саюза ў 2015 годзе.

Маладым і таленавітым

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Распараджэнне аб прызначэнні стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам на 2016 год.

У прыватнасці, стыпендыі прызначаны 92 маладым навукоўцам, у тым ліку 5 дактарам навук ва ўзросце да 45 гадоў, 52 кандыдатам навук ва ўзросце да 35 гадоў і 35 маладым навукоўцам без ступені ва ўзросце да 30 гадоў. Сярод іх прадстаўнікі фізіка-матэматычных, тэхнічных, хімічных, біялагічных, медыцынскіх, аграрных, эканамічных, юрыдычных, геолага-мінералагічных, сацыяльных і гуманітарных навук, паведамляе прэс-службa Прэзідэнта.

Стыпендыяты атрымалі істотныя вынікі па прыярытэтных напрамках фундаментальных і прыкладных даследаванняў, якія маюць навуковае і практычнае значэнне. Іх навуковыя дасягненні выкарыстоўваюцца ў дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый розных галін эканомікі і ўстаноў сацыяльнай сферы Беларусі. Навізна многіх распрацовак пацверджана патэнтамі на вынаходкі і публікацыямі ў вядучых айчынных і замежных навуковых часопісах.

Падпісанне распараджэння з'яўляецца сведчаннем падтрымкі дзяржавай таленавітых маладых навукоўцаў і развіцця навуковага патэнцыялу краіны.

■ На думку парламентарыя

НАСТУПНЫ ГОД У ЭКАНОМІЦЫ — БЕЗ ШОКАЎ

У пятніцу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў тры ўказы, якія тычацца быццам бы розных сфер, тым не менш усе яны звязаны паміж сабой. «Звязда» звярнулася да дэпутата Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Валерыя БАРАДЗЕНІ з просьбай пракаментаваць гэтыя дакументы.

Указам №504 ад 18 снежня 2015 года кіраўніком дзяржавы вызначаны ключавыя паказчыкі эфектыўнасці работы ўрада Беларусі і Нацыянальнага банка. Пастаўлена задача дасягнення росту: ВУП — не менш за 0,3%, вытворчасці працы — не менш за 1,5%, экспарту тавараў і паслуг — не менш за 3,5%, даходаў насельніцтва — не менш за 0,5%.

Як адзначылі ў Міністэрстве эканомікі, увядзенне сістэмы ключавых паказчыкаў эфектыўнасці з'яўляецца навацыяй. Савету Міністраў даручана вызначыць ключавыя паказчыкі эфектыўнасці і работы кіраўнікоў міністэрстваў, канцэрнаў, аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, а таксама арганізацый, маёмасць якіх знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы або ў статутных фондах, дзе палова і больш акцый належыць дзяржаве.

Другі ўказ, №505, зацвердзіў асноўныя кірункі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на наступны год. Так, у 2016 годзе прыярытэтнай мэтай названа зніжэнне інфляцыі да 12 працэнтаў.

— Гэта цалкам дасягальная мэта, і мы ў 2016 годзе выйдзем на гэту лічбу, — лічыць Валерый Барадзеня. — Такі падыход не прадугледжвае шокаў у эканоміцы. Калі ў Авальнай зале зацвярджалася названая лічба, выказваліся прапановы замахнуцца і на большае зніжэнне. Але, калі б мы спрабавалі больш зніжаць інфляцыю, гэта магло б адбіцца на рэальным сектары і было б падобна на «зацісканне гаек». Найважнейшыя параметры прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны вызначаны, зыходзячы з рэальных паказчыкаў. Пры прыняцці законаў мы абапіраліся на ўсе лічбы (валавы ўнутраны прадукт, вытворчасць працы, экспарт тавараў і паслуг), якія мелі на той момант. Так, паказчык па ВУП сёлета знаходзіўся на стабільным узроўні: ён не рос, але і не зніжаўся. Калі мы зможам захаваць эканоміку на ўзроўні, які маем, гэта будзе ўжо добрым дасягненнем. Сёння цяжка прадказаць, колькі будзе каштаваць нафта. Таксама трэба сачыць і за курсам расійскага рубля. Безумоўна, год будзе складаным. Але ўсе лічбы, якія зацверджаны законамі, рэальныя. Давайце не забывацца, што дабрабыт краіны залежыць ад кожнага з нас, ВУП залежыць ад работы кожнага канкрэтнага чалавека на сваім працоўным месцы. Я лічу, што для моцных людзей і краін час крызісу — гэта час магчымасцей. Калі звярнуцца да гісторыі, можна заўважыць, што падчас сур'ёзных цыклічных спадаў у сусветнай эканоміцы знаходзіліся краіны, якія развіваліся. Напрыклад, Сінгапур і Ганконг. Нам таксама трэба шукаць шляхі для росту, вызначыць прыярытэты ў эканоміцы.

Яшчэ адзін дакумент, указ №503, тычыцца маладых і шматдзетных сем'яў. Так, памер фінансавай падтрымкі, якая будзе прадастаўляцца ім, вырасце ў два разы.

— Безумоўна, унясенне змяненняў і дапаўненняў ва ўказ «Аб прадастаўленні маладым і шматдзетным сем'ям фінансавай падтрымкі дзяржавы» — гэта своечасовыя меры, якія тычацца дэмаграфічнай палітыкі, — адзначыў Валерый Барадзеня. — Неабходна ствараць умовы, каб сем'і рашаліся нараджаць дзяцей, гэта аснова бяспекі нацыі. Сёння ў многіх багатых краінах невысокая нараджальнасць. Дэмаграфічная бяспека падтрымліваецца за кошт эмігрантаў. Мы спадзяёмся, што Беларусь знойдзе ўнутраныя сілы, каб вырашыць такую праблему, што ў нашых сем'ях будуць нараджаць больш дзяцей. Варта аказваць шматдзетным сем'ям і грамадскую падтрымку, піярыць іх, знаёміць людзей з паспяховымі, добрымі сем'ямі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

■ Сацпакет

УРАД ПААБЯЦАЎ ЗАХАВАЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

Сацыяльныя гарантыі на найбліжэйшыя тры гады работнікам забяспечыць новае Генеральнае пагадненне паміж прафсаюзамі, наймальнікамі і Саветам Міністраў. «Усе абавязкі ўрада — па росце заработнай платы, занятасці, сацыяльным выгодам, развіцці аховы здароўя і адукацыі — адлюстраваны ў дакументе, які мы падпісалі», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.
Хто будзе застрахаваны ад скарачэння і што рабіць, каб работнікі збанкрутаваных фірм не засталіся без заробкаў?

Працэнты па крэдытах на заробкі трэба знізіць

Старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях запэўніў, што большасць палажэнняў мінулага пагаднення выкананы:

— Сёння 75 працэнтаў працоўных рэсурсаў заняты ў эканоміцы. Гэта добры паказчык. Прафсаюзы стараліся многае зрабіць, каб не даць скараціць людзей.

Разам з тым у рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці цяпер працуе восем працэнтаў ад сярэднясписачнай колькасці работнікаў.

— Такая сітуацыя на рынку была і раней, — заўважае **намеснік міністра эканомікі Ірына КАСЦЕВІЧ.** — Калі разглядаць фінансавы крызіс 2009 года, то ў рэжыме няпоўнай занятасці тады працавала больш за 360 тысяч чалавек (сёлета на скарочаным тыдні было на 100 тысяч работнікаў менш. — **Аўт.**) У сённяшніх умовах гнуткія формы занятасці, такія як скарачэнне вакантных пасад, змяншэнне працягласці працоўнага дня, разглядаюцца ў якасці інструментаў ўрэгулявання беспрацоўя. Трэба адзначыць, што ў другой палове 2015 года назіраецца змяншэнне няпоўнай занятасці.

Большасць людзей, якія былі вымушаны перайсці на скарочаны тыдзень, — з прамысловых і будаўнічых прадпрыемстваў. У гэтых сферах доля работнікаў, што працуюць у рэжыме няпоўнай занятасці, складае 22 і 26 працэнтаў адпаведна. Адна з прычын, чаму будаўнікоў пераводзяць на такі рэжым, — дэбіторская запазычанасць заказчыкаў за выкананыя працы. Арганізацыям павінны 4,5 трыльёна рублёў.

— Ва ўмовах несвоечасовых разлікаў заказчыкаў падрадчыкі вымушаны для выплаты заробкаў звяртацца ў банкі, — тлумачыць сітуацыю **намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр СІДАРАЎ.** — Толькі ў кастрычніку 20 арганізацый па лініі нашага міністэрства звярталіся па крэдыты. Агульная сума прыцягнутых рэсурсаў — 280 мільярдаў. З іх 177 мільярдаў пайшлі на заработную плату. Выплачаных працэнтаў — 23 мільярды. Гэта значныя сродкі, якія потым не кампенсуюцца заказчыкам і цягнуць стратнасць. Арганізацыі не могуць закупляць матэрыялы, сыравіну, запраўляць палівам машынныя механізмы, камандзіраваць людзей. Усё гэта стрымлівае развіццё галіны.

Міністэрства, у сваю чаргу, стараецца дапамагчы падведамасным арганізацыям. Прад'яўляе прэтэнзіі заказчыкам, спаганяе грошы праз падатковыя органы, у судовым парадку. Удзельнічае ў працы і ўрад: працуе Рэспубліканская камісія па каардынацыі разлікаў за выкананыя працы ў будаўніцтве.

— Мы робім тое, што можам у межах сваёй кампетэнцыі, але пытанне не вырашаецца. На наш погляд, заказчыкі не лічаць гэта праблемай. Трэба даносіць да іх, што, ствараючы дэбіторскую запазычанасць, яны «караюць» працоўныя калектывы, звычайных рабочых. Так быць не павінна, — кажа Аляксандр Сідараў.

Прафсаюзы лічаць, што заказчыкі ў такім выпадку таксама павінны несці выдаткі. Напрыклад, кампенсаваць выплаты па працэнтах. А банкам варта было б зніжаць працэнтную стаўку, калі крэдыт выдаецца на пагашэнне заробкаў пры дэбіторскай запазычанасці.

Ёсць праблема і з выплатамі супрацоўнікам у выпадку банкруцтва арганізацый. Каля 400 прадпрыемстваў на сёння не могуць разлічыцца са сваімі работнікамі своечасова.

— Мы абмяркоўвалі гэтую сітуацыю і з дэпутатамі Нацыянальнага сходу, і з Генеральнай пракуратурай, і з Мінпрацы і Мінэканомікі, — распавядае **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Алена МАНКЕВІЧ.** — Напэўна, вырашаць гэтую праблему трэба ўжо на дзяржаўным узроўні, паколькі на момант банкруцтва арганізацый адсутнічае рэальны механізм пагашэння запазычанасці па заробках. І ўзяць грошай няма адкуль. Можа, гэта будзе нейкі фонд, куды наймальнікі пералічваюць сродкі, як гэта робяць краіны Прыбалтыкі і Расія, можа, выпрацуем свой індывідуальны падыход. Але вырашаць названую праблему трэба было ўжо ўчора.

Умовы іншыя — заробак той жа

У Генеральным пагадненні на 2016—2018 гады ёсць шэраг новаўвядзенняў.

— Надзвычай важным нам бачыцца прыняцце неадкладных захадаў па сацыяльнай падтрымцы беспрацоўных, — каментуе Міхаіл Орда. — Мы заклікаем аддаваць прыярытэт актыўным мерам палітыкі занятасці. Прапануем у выпадку прыватызацыі арганізацый прадугледжваць у інвестыцыйных дагаворах абавязацельства захоўваць занятасць работнікаў на тым жа ўзроўні не менш за тры месяцы. Гэта дазволіць у планавым парадку вырашаць пытанні з працаўладкаваннем і перанавучаннем спецыялістаў, якія вызваляюцца.

Пашыраны пералік асоб, якім аддаецца перавага застацца на месцы пры скарачэнні штату. У гэты спіс уключаны работнікі перадпенсійнага ўзросту, а таксама тыя, хто атрымаў працоўнае калецтва ці прафесійнае захворванне на вытворчасці. У Генеральным пагадненні таксама ёсць норма, згодна з якой пры ўвядзенні новых умоў аплаты працы памер заробку не павінен зніжацца.

Пры заключэнні калектыўных дагавораў трэба ўводзіць нормы па выплаце заработнай платы не радзей за два разы на месяц і не пазней за 25-е чысло наступнага месяца. «Гэта прапанова ўзнікла невыпадкова, — тлумачыць старшыня ФПБ. — Апошнім часам мы, на жаль, усё часцей сутыкаемся з прыкладамі, калі наймальнікі прапаноўваюць перанесці выплату заробку на апошні дзень месяца. Але трэба ўлічваць, што большасць абавязковых плацяжоў насельніцтва павінна рабіць да 25-га чысла. Перанос даты выплат можа стаць прычынай штрафаў. Гэта несправядліва».

У сённяшніх эканамічных умовах наймальнікі, зразумела, спрабуюць эканоміць на сацыяльным пакеце. Але здараюцца выпадкі, калі работнікаў проста ставяць перад фактам скарачэння гарантый без тлумачэння прычын і тэрмінаў такога рашэння. У новае пагадненне ўнесена норма, якая дазваляе, па ўзгадненні бакоў, прыпыніць дзейнасць тых ці іншых палажэнняў дагавора, не адмяняючы іх. Але пры гэтым павінен быць вызначаны перыяд прыпынку і механізм аднаўлення гэтых гарантый.

Генеральнае пагадненне на 2016—2018 гады таксама прадугледжвае механізм кантролю за выкананнем палажэнняў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Мы і свет

СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ...

Прэзентацыя відэароліка «Беларусь — краіна для жыцця» прайшла ўчора ў Мінску

Ён ужо транслюецца на міжнародным тэлеканале «СТС Інтэрнэшнл», у хуткім часе яго пачнуць паказваць па «Еўраньюс», а таксама па іншых міжнародных каналах. Гэта не выпадкова. Інтарэс да нашай краіны за мяжой расце як сярод турыстаў, так і сярод інвестараў — важна яго задаволіць.

Ідэя відэароліка належыць Міністэрству інфармацыі.

— Гэта наша вялікая праца па стварэнні іміджу краіны, — заўважыла ў размове з журналістамі **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ў Пасланні Парламенту і беларускаму народу асобна спыняўся на тым, наколькі важна, каб сродкі масавай інфармацыі працавалі на імідж краіны. Мы бачым, што на замежных каналах краіны рэкламуюць сябе. Гэтым самым ствараюцца ўмовы для прывабліванне турыстаў, інвестыцый. Думаю, несправядліва, што ў Беларусі не было дагэтуль такога роліка, які, як мне здаецца, сёння вельмі актуальны.

Відэа пачынаецца з пытання: што самае галоўнае ў жыцці? На працягу роліка глядач мае магчымасць не толькі атрымаць асалоду ад нашых краявідаў, але і знайсці адказ на гэтае пытанне.

Міністр інфармацыі ўпэўнена: самае галоўнае — само жыццё.

— Гэта можна паказаць праз сям'ю, праз простых людзей, якія сустракаюць раніцу новага дня са сваімі клопатамі, — расказала яна. — Як у гэтым ролiку: паспяховы тата, цікавая мама, дзеці — усе заняты, усе жывуць у прыгожай, годнай краіне. Мы проста ўлюбіліся ў гэты ролік на этапе знаёмства са сцэнарыем. Натуральна, захацелася, каб прадукт з'явіўся.

Міністэрства плануе задзейнічаць усе магчымыя кантакты ў рамках рэалізацыі міжурадавых пагадненняў з цэлым шэрагам дзяржаў, каб распаўсюдзіць гэты відэапрадукт.

— Цікавасць да Беларусі велізарная, — кажа Лілія Ананіч. — Наша дзяржава, як ніякая іншая, менавіта ў гэты перыяд паказвае, наколькі важна быць прасторай міру, дабра. Мы адбыліся як краіна, дзе знаходзяць разуменне розныя бакі канфлікту ва Украіне. Мы бачым, што палітыка, якая праводзіцца нашым Прэзідэнтам, падтрымана народам. Мы хочам, каб Беларусь заўсёды была краінай для жыцця.

Па словах **прадзюсара Валерыя КРАЎЧУКА**, галоўнай задачай падчас працы над відэа было «перанесці эмоцыі са сцэнарыя ў відэарад».

— У выніку ролік атрымаўся вельмі добрым, пранікнёным, — канстатуе ён.

Яго калега **прадзюсар Уладзімір ПАПОЎ** дадае, што гэта відэа — першы прадукт такога ўзроўню, зроблены цалкам у нашай краіне і нашымі людзьмі.

— Кожны ўклаў часцінку свайго таленту, — кажа прадзюсар.

Кастынг для акцёраў быў доўгім — больш чым 1,5 месяца: доўга не маглі знайсці патрэбныя тыпажы.

Акцёр Аляксандр БРУХАЦКІ, які сыграў ролю дзядулі, быў выбраны амаль адразу.

— Трэба знаходзіць магчымасць працягваць гэтую справу, — упэўнены ён. — Я ўдзячны, што ўдзельнічаў у такім праекце. Раней спявалі: мой адрас не дом і не вуліца, мой адрас — Савецкі Саюз. Я з гонарам скажу: мой адрас — Беларусь. Я вельмі задаволены, што расказаў пра свой дом.

Актуальнасць роліка падкрэсліў і **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў.**

— Гэты ролік нам спатрэбіцца з многіх прычын, — адзначае прадстаўнік МЗС. — Фіксуецца змяненне адносін да Беларусі ў пазітыўны бок. Яно адбываецца праз рэальныя фактары, у тым ліку такія, што не залежаць ад нас наўпрост. У гэтым зале, дзе зараз праходзіць прэзентацыя, ужо больш за 20 разоў сустракалася трохбаковая кантактная група па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне. Інтарэс да нас расце і з прычыны тых унутрыпалітычных мерапрыемстваў, якія ў нас праводзяцца на вельмі высокім узроўні. Гэты інтарэс мае не толькі якаснае, але і колькаснае выражэнне: такога рэзкага росту пастаянна акрэдытаваных замежных карэспандэнтаў, як зараз, у нас не было гадоў дзесяць.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■

ПАДАРУНКІ АД МЕЦЭНАТА

Іх атрымалі музей гісторыі Магілёва і бібліятэка імя Карла Маркса падчас вечара-партрэта, прысвечанага Валерыю КАЗАКОВУ

Імя гэтага пісьменніка, палітыка, дзяржаўнага дзеяча Расіі і наогул шчодрай душы чалавека добра вядома магіляўчанам не толькі па яго творах, але і па справах. Гэта дзякуючы яго намаганням музей гісторыі Магілёва папоўніўся сапраўднымі рарытэтамі, сярод якіх Статут ВКЛ XVIII стагоддзя — адзіны ў краіне арыгінал выдання, а чытачы цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса атрымалі магчымасць далучыцца да сапраўдных скарбаў мастацкай і гістарычнай літаратуры.

Валерый КАЗАКОЎ перадае гістарычныя каштоўнасці музею гісторыі Магілёва.

Валерый Казакоў — часты госць у Магілёве. На гэты раз ён прыехаў па запрашэнні гарадской бібліятэкі, якая арганізавала ў Ратушы кранальную літаратурна-музычную кампазіцыю пра жыццё і творчасць пісьменніка. Нават на сустрэчу са сваімі прыхільнікамі ён прыйшоў не з пустымі рукамі. Кожны атрымаў у падарунак кнігу і аўтограф ад аўтара. А галоўнае, спадар Казакоў працягвае вяртаць Радзіме страчаныя каштоўнасці. Дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей Бацюкоў не хаваў свайго захаплення ад перададзеных мецэнатам рарытэтаў — іх чатыры. Чаго каштуе толькі адна падвеска з трызубцам часоў княжання Уладзіміра Чырвонае Сонейка.

— Такіх прадметаў вядома некалькі, — адзначыў ён. — Гэта было чымсьці накшталт адзнакі чалавеку, які вызначыўся. Магчыма, яго ўладальнікам быў наш мясцовы дружыннік. Дакладна не вядома і пахаджанне шаблі, якая яшчэ нядаўна прадавалася ў Беларусі на аўкцыёне. Наш добры сябар Андрэй Радкоў, які некалькі гадоў таму ініцыяваў пакупку Статута і па сённяшні дзень дапамагае музею шукаць розныя артэфакты, «прасігналіў» нам, і мы звязаліся з Валерыем Казаковым. Шабля магла трапіць у Магілёў у выніку нейкіх паходаў або разам з прадстаўнікамі пасольстваў. Па перыядзе існавання рэч адпавядае Хазарскаму каганату — гэта прыкладна X стагоддзе. Такія шаблі былі вельмі распаўсюджаны на поўдні Украіны і Расіі. А вось дзве дзіды XVI—XVII стагоддзяў прадаў мецэнату магілёўскі калекцыянер. Цяпер яны таксама ў нас.

Падвеска часоў Уладзіміра Чырвонае Сонейка.

Не засталася без чарговых падарункаў і бібліятэка імя Карла Маркса. На гэты раз яе фонды папоўніліся двума цікавымі выданнямі, адно з якіх — «Найстаражытнейшая гісторыя славян» Ягора Класена.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

■ Здорава!

«БЕЗ ПРОЦІВАГАЗА БЕГЧЫ ПРАСЦЕЙ»

Сталічны 133-метровы гмах «Парус» прыняў першыя ў Беларусі спаборніцтвы па забегах па прыступках

Беларусы прызвычаіліся бегаць па зямлі, але, калі ім прапанавалі пабегчы ўверх па лесвіцы, як ужо даўно робяць за мяжой, аказалася, што попыт перавышае прапанову.

— Паглядзіце, які ажыятаж! — кажа ў дыктафон яўна задаволены Вадзім Дзевятоўскі, старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі. — Мы ўпершыню праводзім падобныя спаборніцтвы. Загадзя папярэджвалі, што ўдзел прымуць толькі 150 чалавек, але людзей усё роўна прыйшло больш. Бачна, як шмат тых, хто хоча праводзіць свой вольны часам разам са спортам. Што цікава, пабягуць не толькі жыхары сталіцы, але і прадстаўнікі іншых беларускіх гарадоў.

Сэнс гэтых спаборніцтваў просты. Хто сярод дзяўчат і мужчын хутчэй дабяжыць да 35-га паверха самага высокага жылога будынка краіны, той пераможа і атрымае сертыфікат на 2,5 мільёна рублёў. На словах задача простая. Але, калі прыгадваеш, што многія праз ляноту на трэці паверх ездзяць на ліфце, разумееш, што гэтыя спаборніцтвы — яшчэ тое выпрабаванне.

Каб папярэдзіць траўматычнасць, кожнага спартсмена на старт адпраўлялі з невялікім інтэрвалам. Гэта значыць, кожны рушыў з індывідуальным часам. Найлепшым ён аказаўся ў 40-гадовага мінчаніна Аляксандра Клюйко, які ўзняўся на 35-ты паверх за 2 хвіліны і 51 секунду. Сярод дзяўчат першае месца заняла Ганна Максімава з Віцебска.

— Я служу ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, і ў нас кожны год праводзяцца падобныя спаборніцтвы ў Нацыянальнай бібліятэцы сярод пажарных і ратавальнікаў, — прызнаўся Аляксандр Клюйко. — Толькі там мы бяжым у поўнай амуніцыі, якая важыць прыблізна 20 кілаграмаў, на 25-ы паверх. Тут без процівагаза беглася прасцей.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■

БЮДЖЭТ ЗАХАВАЕ САЦЫЯЛЬНУЮ НАКІРАВАНАСЦЬ

Пра гэта заявіла **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.** «Фарміраванне бюджэту — гэта вельмі сур'ёзна і адказна. Такім чынам плануецца развіццё краіны на найбліжэйшыя гады. Вядома, вялікае значэнне мае тое, што захоўваецца сацыяльная накіраванасць бюджэту на 2016 год. Бо самае галоўнае ў Беларусі — гэта чалавек, яго клопаты і патрэбы», — адзначыла яна.

Каб бачыць, як рэалізуюцца захады, што прымаюцца на дзяржаўным узроўні, урад усё часцей арганізуе выязныя пасяджэнні ў рэгіёнах. Гэта дае магчымасць азнаёміцца з праблемамі, якія сёння існуюць, і ўпэўніцца, што мясцовая ўлада прымае аб'ектыўныя і правільныя рашэнні.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

З БРЭСТА — У МАЛАДЗЕЧНА

пераехаў сімвал культурнай сталіцы краіны

У Брэсце прайшоў заключны гала-канцэрт майстроў мастацтваў. На гэтым мерапрыемстве горад над Бугам перадаў свайму пераемніку — Маладзечну — сімвал культурнай сталіцы.

Фота БЕЛТА.

На святкаванні гаварылася, што за год у Брэсце адбыліся сотні мерапрыемстваў пад знакам культуры. Многія з іх даўно сталі традыцыяй Брэста, яны і забяспечылі гораду гэты ганаровы статус. Найперш можна сказаць пра міжнародныя фестывалі: класічнай музыкі — «Студзеньскія музычныя вечары» і тэатральнага мастацтва — «Белая вежа». Названыя брэнды зрабілі наш горад пазнавальным далёка за яго межамі. Тут жа можна адзначыць і інтэлектуальны форум «Берасцейскія кнігазборы», які стаў важнай кампаніяй на шляху даследавання гісторыі абласнога цэнтра і рэгіёна.

Нельга не адзначыць, што статус культурнай сталіцы Брэст насіў у год 70-годдзя Перамогі. Нямала знакавых мерапрыемстваў прайшло ў Брэсцкай крэпасці і яе музеях.

А вось, напрыклад, форум вулічных тэатраў і Берасцейскі карнавал гараджане ўбачылі ўпершыню на свяце горада. І **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** выказаўся за карнавал, а таксама бард-фестываль імя Уладзіміра Высоцкага як новыя культурныя традыцыі Брэста.

Аляксандр Рагачук перадаў **старшыні маладзечанскага райвыканкама Аляксандру ЯХНАЎЦУ** сімвалічны знак культурнай сталіцы з пажаданнем памнажаць культурныя традыцыі радзімы Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

ВЕТРАНА І ДАЖДЖЫ

Сіноптыкі аб'явілі сёння штармавое папярэджанне, бо парывы ветру будуць дасягаць 22 м/с

Даволі анамальнае цёплае надвор'е захаваецца ў нас і на гэтым тыдні. У першыя тры дні на тэрыторыі краіны будуць гаспадарыць атмасферныя фронты, што рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Сапраўды складаныя ўмовы надвор'я прагназуюцца сёння. Часам чакаюцца дажджы і будзе дзейнічаць штармавое папярэджанне: на большай частцы тэрыторыі ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — месцамі да 22 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 4-10 градусаў. Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца паўсюдна і ў сераду. У некаторых раёнах магчымы туман. Штарміць стане менш, але месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-9 градусаў, удзень — ажно 6-12 цяпла.

Надвор'е палепшыцца ў другой палове тыдня, калі з ростам атмасфернага ціску дажджоў стане менш і сціхне вецер. Уначы на чацвер (25 снежня) месцамі, а ўдзень — па паўночным усходзе прагназуюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах будзе туман. Аднак крыху пахаладае. Тэмпература паветра на працягу сутак плануецца на ўзроўні ад 3 да 9 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ў некаторых раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, пры праясненнях — да 2 марозу, удзень будзе 2-8 цяпла. У суботу праз нашу краіну будзе праходзіць атмасферны фронт, які прынясе нам кароткачасовыя дажджы, а па поўначы Беларусі магчымы мокры снег. У асобных раёнах чакаецца туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, а ўдзень будзе 1-7 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

СТАЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫМІ АД ІМПАРЦЁРАЎ

Атамная энергетыка як дадатковая гарантыя эканамічнай самастойнасці

Цягам апошніх некалькіх гадоў у краіне істотна знізіўся знос асноўных вытворчых фондаў айчыннай энергасістэмы. Палепшыўся і шэраг важных тэхналагічных паказчыкаў. Неэфектыўныя вытворчыя магутнасці паступова выводзяцца, а высокаэфектыўныя ўкараняюцца.

Асноўным відам паліва застаецца прыродны газ, які імпартуецца з Расіі; доля яго складае каля 95 працэнтаў у вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі. Гэта аказвае істотны ўплыў на ўзровень энергетычнай бяспекі, павысіць які павінны мерапрыемствы, скіраваныя на павышэнне бяспекі і энергаэфектыўнасці. Адным з такіх мерапрыемстваў стаў распачаты ў 2012 годзе праект па будаўніцтве атамнай электрастанцыі сумарнай магутнасцю 2400 МВт.

— Стварэнне атамнай энергетыкі — гэта новы інтэлектуальны і тэхналагічны імпульс у развіцці краіны і забеспячэнне дадатковых гарантый умацавання дзяржаўнай незалежнасці і эканамічнай самастойнасці, — кажа **міністр энергетыкі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПАТУПЧЫК.** — Рэалізацыя гэтага праекта дазволіць атрымліваць 17 млрд кВт/г у год, а гэта азначае, што кожны год мы будзем замяшчаць 5 млрд м³ імпартаванага прыроднага газу. Плануецца, што пасля ўвядзення першага энергаблока атамнай электрастанцыі краіна цалкам адмовіцца ад закупак электраэнергіі.

— Ці ўдалося сёлета асвоіць грашовыя сродкі дзяржаўнага экспартнага крэдыту, прадугледжанага кантрактам з расійскім бокам на будаўніцтва АЭС?

— Паводле генеральнага кантракта, аб'ём засваення капітальных укладанняў на ўзвядзенне БелАЭС цягам гэтага года не вызначаны. Аднак за кошт сродкаў дзяржаўнага экспартнага крэдыту, прадастаўленага ўрадам Расійскай Федэрацыі, асвоены 491 мільён долараў, а ўсяго па выніках года на будаўніцтва атамнай электрастанцыі плануецца асвоіць 560 мільёнаў долараў.

— Наколькі актыўна былі задзейнічаны беларускія арганізацыі ў будаўніча-мантажных работах, пастаўках абсталявання і матэрыялаў?

— Будаўніцтва энергаблокаў №1 і №2 ажыццяўляецца ў адпаведнасці з графікам, прадугледжаным генеральным кантрактам на ўзвядзенне БелАЭС. Зараз праводзяцца работы па будаўніцтве ўсіх асноўных будынкаў энергаблокаў, а таксама дапаможных аб'ектаў атамнай электрастанцыі. Работы вядуцца на 102 аб'ектах са 131 паводле прадугледжанай праектам тэхналагічнай паслядоўнасці.

Сёння ў Беларусі працуюць 15 міні-ЦЭЦ, звыш 3 тысяч кацельняў на мясцовых відах паліва. На рэках пабудавана 46 ГЭС. Энергію ветру выкарыстоўваюць 14 энергаўстановак, сонца – 19 фотаэлектрычных станцый, працуюць 17 біягазавых комплексаў.

На ўзвядзенні будынкаў задзейнічана 27 субпадрадных арганізацый, у тым ліку 21 беларуская і 6 расійскіх арганізацый. Усе будаўнікі забяспечаны жыллём і ўсім неабходным. На пляцоўцы АЭС сёння працуюць звыш 5 тысяч будаўнікоў. За час будаўніцтва выканана будаўніча-мантажных работ на больш як 25 млрд расійскіх рублёў. Каля 80 працэнтаў работ зроблена менавіта беларускімі арганізацыямі. Акрамя таго, яны ажыццяўляюць пастаўку будаўнічых матэрыялаў і агульнапрамысловага абсталявання. Абсталяванне беларускай вытворчасці складае, праўда, усяго 9 працэнтаў ад пастаўленага агульнапрамысловага абсталявання з пачатку будаўніцтва.

Для актывізацыі работы па лакалізацыі вытворчасці, паставак беларускімі арганізацыямі абсталявання і матэрыялаў для будаўніцтва атамнай станцыі пастановай Савета Міністраў сёлета была створана міжведамасная рабочая група з удзелам прадстаўнікоў генпадрадчыка ЗАТ «Атамбудэкспарт». Рабочая група вызначыла асноўныя кірункі лакалізацыі вытворчасці і паставак, у прыватнасці па буйной зборцы трубаправодаў і вырабе апорна-падвесных сістэм, па лакалізацыі кабельна-праводніковай прадукцыі, вентыляцыйнага абсталявання...

— Ці экспартуе Беларусь электраэнергію, як можа змяніцца сітуацыя пасля пуску АЭС?

— З увядзеннем БелАЭС экспартны патэнцыял краіны, відавочна, узрасце. Пры гэтым магчымымі кірункамі экспарту электраэнергіі стануць краіны Балтыі і Польшча. Аб'ёмы экспарту будуць вызначацца захаваннем і развіццём электрычных сувязяў з гэтымі краінамі; кан'юнктурай цэн на электраэнергію — і ў нас, і там; заканадаўствам, якое павінна прадугледжваць доступ «трэціх» краін да рынкаў электраэнергіі; электрасеткавай інфраструктурай для транзіту электраэнергіі ў краіны Заходняй Еўропы.

— З якім вынікам завершана Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся? Да якіх гарадоў рэгіёна падведзены газаправоды?

— Наша міністэрства ў рамках Дзяржаўнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010-2015 гады ажыццяўляе газіфікацыю аграгарадкоў Брэсцкай вобласці.

Ужо ўведзена ў эксплуатацыю каля 80 км падводзячых газаправодаў. Затрачана на гэта каля 48 млрд рублёў. Прыродны газ быў пададзены да гарадскога пасёлка Лагішын, аграгарадкоў Аснежыцкі, Ахова, Валішча Пінскага раёна і Вулька, Палескі Лунінецкага, а таксама да сельскіх населеных пунктаў Ганчары, Кашэвічы і Камень Пінскага раёна.

— Якія работы, аб'екты былі праінвеставаныя ў 2015 годзе? Хто прадаставіў крэдыты?

— З 2008 года міністэрства рэалізуе разам з кітайскімі кампаніямі шэраг інвестыцыйных праектаў.

Згодна з зацверджанымі інвестыцыйнымі праграмамі за 9 месяцаў гэтага года было накіравана на асваенне інвестыцый у асноўны капітал звыш 10 трлн рублёў.

Уведзена ў эксплуатацыю звыш 1,2 тыс. км ліній электраперадачы, каля 35 км цеплавых сетак, 731 км размеркавальных газаправодаў;

газіфікавана прыродным газам больш за 25 тысяч кватэр;

пераведзена на спажыванне прыроднага газу звыш 11 тысяч кватэр.

Сёлета ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця Беларускай энергетычнай сістэмы адбываецца рэалізацыя такіх інвестыцыйных праектаў, як будаўніцтва Полацкай і Віцебскай ГЭС, рэканструкцыя Гомельскай ЦЭЦ-1 і Магілёўскай ЦЭЦ-1, будаўніцтва падстанцыі 110 кВ «Старабарысаўская» з кабельнымі лініямі 110 кВ у Мінску, былі выкананы будаўніча-мантажныя работы па выдачы магутнасці ад АЭС. Завяршаюцца будаўніцтва міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва ў Лунінцы і замена ПТ Р-6 на ПТ Р-12 на Аршанскай ЦЭЦ.

Асноўнай крыніцай фінансавання арганізацыямі міністэрства інвестыцый у асноўны капітал сёлета былі прыцягнутыя крэдыты. Так, за кошт крэдыту Расійскай Федэрацыі ажыццяўляецца будаўніцтва БелАЭС,

ільготныя крэдыты Дзяржаўнага банка развіцця Кітая выкарыстоўваюцца на будаўніцтва Віцебскай ГЭС,

Эксімбанка Кітая — на будаўніцтва ліній электраперадачы для выдачы магутнасці ад АЭС,

крэдыты Еўразійскага банка — на будаўніцтва Полацкай ГЭС.

За кошт крэдытаў Сусветнага банка пачата рэканструкцыя Магілёўскай ЦЭЦ-1 і Гомельскай ЦЭЦ-1. Сеткі электра-, цепла- і газазабеспячэння для ўводу жылых дамоў па праграмах аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама будуюцца арганізацыямі Мінэнерга за кошт ільготных крэдытаў ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь».

У 2011—2015 гадах уведзена ў эксплуатацыю звыш 1900 МВт новых высокаэфектыўных генерыруючых магутнасцяў, забяспечана будаўніцтва сетак энергазабеспячэння для ўвядзення ў эксплуатацыю жылых дамоў па праграмах аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, працягваецца развіццё газіфікацыі сельскіх населеных пунктаў краіны.

Для стымулявання вытворчасці працы сярод арганізацый праводзяцца галіновыя вытворчыя спаборніцтвы. Пераможцамі па выніках мінулага года сталі, напрыклад, «Мінскаблгаз», Жыткавіцкі торфабрыкетны завод, «Гроднаэнерга», «Захадэлектрасеткібуд», навукова-даследчае і праектнае прадпрыемства «БелЦЭІ». Сярод філіялаў у першым паўгоддзі гэтага года найлепшымі былі прызнаныя Лукомльская ДРЭС, Маладзечанскія электрасеткі, Гомельскія цеплавыя сеткі, структурнае падраздзяленне па збыце «Магілёўэнерга».

Айчынную энергасістэму прадстаўляе дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Белэнерга». У склад гэтага высокатэхналагічнага комплексу ўваходзяць шэсць рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў энергетыкі — яны генеруюць электрычную і цеплавую энергію, ажыццяўляюць яе перадачу, размеркаванне, збыт; прадпрыемства, якое ажыццяўляе цэнтралізаванае аператыўна-дыспетчарскае кіраванне энергасістэмай краіны; прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць будаўніцтва, мантаж, рамонт, наладку і рэканструкцыю аб'ектаў электраэнергетыкі; прадпрыемствы, занятыя навукова-даследчай, доследна-канструктарскай, тэхналагічнай працай, праектаваннем і будаўніцтвам аб'ектаў электраэнергетыкі. Увогуле гэта 30 прадпрыемстваў, на якіх працуе больш за 65 тысяч чалавек.

Энергетыка Беларусі — той базавы элемент, тая сістэма, якая гарантуе эфектыўнасць дзейнасці любой галіны або суб'екта эканомікі. Ад энергетычнага складніка ў значнай ступені залежаць выдаткі вытворчасці, даходы грамадства, яго матэрыяльны дабрабыт. Гэта найважнейшы паказчык узроўню развіцця дзяржавы.

КРЫНІЦЫ ЭНЕРГІІ

ВЫТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Агульную магутнасць энергетычнай сістэмы краіны — звыш 10 тыс. МВт — забяспечваюць 41 цеплавая электрастанцыя, якая працуе на прыродным газе, мазуце і мясцовых відах паліва, і 23 энергакрыніцы, што працуюць на аднаўляльных крыніцах (вадзе і ветры).

Працягласць электрасетак складае каля 275 тыс. км, колькасць трансфарматарных падстанцый напружаннем 35-750 кВ — 1338. Працягласць цеплавых сетак склала 5952 км.

Сёлета ўведзена ў эксплуатацыю звыш 1 тыс. км ліній электраперадачы напружаннем 0,4-10 кВ і каля 30 км напружаннем 35-110 кВ.

Эксплуатацыяй электрасетак Беларускай энергасістэмы займаюцца 25 філіялаў, якія ўключаюць 154 раёны. Зона абслугоўвання аднаго раёна складае каля 1,5 тыс. км электрасетак 0,4-10 кВ.

НАДЗЕЙНАЯ РАБОТА

Дзякуючы рэалізацыі шэрагу праграм, у тым ліку Канцэпцыі энергетычнай бяспекі, у апошнія дзесяць гадоў было ўведзена ў эксплуатацыю звыш 2,3 тыс. МВт высокаэфектыўных генеруючых магутнасцяў. Удалося знізіць зношанасць асноўных вытворчых фондаў з 61 да 40,5 працэнта, зменшыць удзельны расход паліва на вытворчасць электраэнергіі на 25–30 г кВт.г, а таксама знізіць тэхналагічныя страты ў электра- і цепласетках.

Акрамя таго, палепшыўся ўзровень індыкатараў энергетычнай бяспекі, значна павысілася надзейнасць работы энергасістэмы. Колькасць адмоў у рабоце асноўнага абсталявання скарацілася амаль удвая, аварыйных адключэнняў ліній электраперадачы стала менш на 60 працэнтаў, а сярэдні час іх аднаўлення скараціўся больш як у паўтара раза.

Эканомія прыроднага газу з 2006 да 2016 года склала каля 4,3 млрд м³. Гэтаму спрыяла некалькі момантаў. Па-першае, зніжэнне ўдзельных расходаў паліва на пастаўку электра- і цеплаэнергіі, па-другое, прыцягненне мясцовых відаў паліва з замяшчэннем прыроднага газу для вытворчасці энергіі і, нарэшце, выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі для вытворчасці электраэнергіі.

МЯСЦОВАЕ — ЭКАНАМІЧНАЕ

Паводле Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай энергетычнай сістэмы, сёлета рэалізуецца некалькі інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, на Аршанскай ЦЭЦ ажыццяўляецца замена паравой турбіны. У Лунінцы завяршаецца ўзвядзенне міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва. У Мінску будуецца падстанцыя «Старабарысаўская» з кабельнымі лініямі 110 кВ ў Мінску. Працягваецца будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астраўцы.

На мясцовых відах паліва працуюць, пачынаючы з 2006 года, ужо дзесяць энергакрыніц: Асіповіцкая і Вілейская міні-ЦЭЦ, Беларуская ДРЭС, Пінская і Пружанская ЦЭЦ, Рэчыцкая міні-ЦЭЦ і міні-ЦЭЦ «Барань», катлаагрэгаты на Жодзінскай ЦЭЦ і Бабруйскай ЦЭЦ-1, біягазавы комплекс СВК «Лебедзева». Асноўнай крыніцай для іх з'яўляюцца трэскі, торф, лігнін, біягаз.

Рэалізацыя толькі гэтых дзесяці праектаў павялічыла выкарыстанне мясцовых відаў паліва на аб'ектах «Белэнерга» у параўнанні з 2006 годам у шэсць разоў. Штогадовае замяшчэнне імпарту прыроднага газу мясцовымі відамі паліва на энергакрыніцах прадпрыемства складае 124,4 млн м³, а гэта эканоміць каля 24 млн долараў.

Сёлета мясцовыя віды паліва дазволяць на 30 млн долараў ЗША знізіць адток валюты з краіны.

Бліжэй да 2025-га

- Стварэнне новых паветраных ліній, рэканструкцыя існуючых.
- Штогадовая рэканструкцыя каля 1500 км размеркавальных электрасетак 0,4–10 кВ як найбольш слабага звяна ў сістэме электразабеспячэння спажыўцоў па прычыне высокай аварыйнасці, звязанай з прыроднымі з'явамі.
- Увядзенне ў эксплуатацыю Беларускай АЭС магутнасцю 2400 МВт.
- Рэалізацыя мерапрыемстваў па рэжымнай інтэграцыі Беларускай АЭС у баланс энергасістэмы:
  - увядзенне ў эксплуатацыю электракатлоў;
  - будаўніцтва пікава-рэзервовых энергакрыніц.
- Замена індукцыйных лічыльнікаў электраэнергіі на электронныя і стварэнне аўтаматызаванай інфармацыйна-вымяральнай сістэмы камерцыйнага ўліку электраэнергіі.

Шаноўныя сябры, паважаныя калегі!

Ад імя апарата кіравання Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» і ад сябе асабіста сардэчна віншую работнікаў і ветэранаў энергетычнай галіны з прафесійным святам — Днём энергетыка!

Уся грандыёзная моц вялікай энергетыкі створана чалавекам і для чалавека. Пачуццё абавязку і адказнасці, любоў да сваёй справы, адданасць прызванню, вернасць краіне — гэтыя словы гучаць у энергетыцы без пафасу, ёмка і паўнавартасна. На патрыятызме закладваліся фундаменты першых цеплаэлектрацэнтраляў, будаваліся першыя энергетычныя аб'екты. На патрыятызме трымаліся людзі ў ваенныя і пасляваенныя гады, захоўваючы, а пасля нарошчваючы магутнасць электрастанцый і пракладваючы лініі электраперадач. Сёння, у год сямідзесяцігоддзя Вялікай Перамогі, мы яшчэ раз з удзячнасцю прыгадваем нашых ветэранаў, дзякуючы подзвігу якіх мы жывём у мірнай і свабоднай краіне.

Высокапрафесійны калектыў Беларускай энергасістэмы здолеў зберагчы духоўную спадчыну пакаленняў энергетыкаў і павялічыць створаны рукамі ветэранаў патэнцыял галіны, забяспечыць надзейнае энергазабеспячэнне спажыўцоў.

За апошнія гады пры падтрымцы Міністэрства энергетыкі нам удалося шмат чаго дасягнуць. Толькі за апошнія тры гады ўведзены ў эксплуатацыю якасна новыя, высокаэфектыўныя генерыруючыя магутнасці, што дазволіла знізіць удзельны расход паліва на падачу электраэнергіі да ўзроўню, які з'яўляецца самым нізкім на постсавецкай прасторы. Значна знізіўся знос асноўных фондаў у галіне. Дынаміка пастаяннага скарачэння колькасці адмоў усіх відаў абсталявання паказвае, што беларуская энергасістэма з кожным годам працуе больш надзейна. Развіваецца малая энергетыка: у энергасістэме працуюць энергакрыніцы, якія спальваюць мясцовыя віды паліва, паспяхова эксплуатуюцца і будуюцца новыя гідраэлектрастанцыі і ветрапаркі. Наперадзе рэалізацыя мерапрыемстваў, распрацаваных з улікам інтэграцыі Беларускай атамнай станцыі ў энергасістэму краіны. І мы годна павінны выканаць узятыя на сябе абавязкі.

Сёння мы забяспечваем стабільную работу адзінай энергасістэмы, мадэрнізуем генерыруючыя магутнасці і будуем сучасныя падстанцыі, пракладваем лініі электраперадач, надзейныя цеплатрасы, аптымізуем схемы цеплазабеспячэння, развіваем міжнароднае супрацоўніцтва і экспарт паслуг. Згуртаваны калектыў прафесіяналаў гатовы браць на сябе адказнасць за самыя складаныя рашэнні.

Дзякуй усім за велізарную работу. «Белэнерга» і надалей будзе прыкладаць усе намаганні, каб нашы прадпрыемствы былі забяспечаны працай, а нашы работнікі мелі дастойны ўзровень жыцця і бяспечныя ўмовы працы.

Зычу ўсім надзейнай, стабільнай і безаварыйнай працы. Дабрабыту вам і вашым сем'ям, моцнага здароўя, удачы і асабістага шчасця!

Генеральны дырэктар ДВА «Белэнерга» Яўген ВОРАНАЎ.

УНП 101339243.

Матэрыялы падрыхтавалі Святлана БАРЫСЕНКА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.

ПРАПАНОВА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА, А КОШТ ЗНІЖАЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярэднія лістападаўскія кошты на новабудоўлі класа «Эканом» у параўнанні з кастрычнікам усё ж «аселі» — мінус 2%. Сярэдні кошт квадратнага метра ў самым бюджэтным класе жылля склаў каля 1120 долараў за квадратны метр, у тым ліку ў аднапакаёвых кватэрах — 1160 долараў, двухпакаёвых — 1125 долараў, а трохпакаёвых — 1055 долараў. У той жа час цяпер усё часцей можна сустрэць у двух- і трохпакаёвых кватэрах цану на ўзроўні 940-980 долараў за квадратны метр. Аднак растэрміноўка аплаты па такіх кватэрах, як правіла, адсутнічае.

У класе «Камфорт», у адрозненне ад «Эканома» і «Стандарту», продажы ідуць не так дынамічна, таму забудоўшчыкамі актыўна «прасоўваюцца» дамы, якія знаходзяцца на ранніх стадыях будаўніцтва, за кошт чаго сярэдняя лістападаўская цана знізілася і ў гэтым класе на 2% да ўзроўню 1430 долараў за квадратны метр. Цяпер цэннік гэтай катэгорыі жылля ў аднапакаёвых кватэрах складае 1485 долараў за квадратны метр агульнай плошчы, двухпакаёвых — 1400 долараў, трохпакаёвых — 1425 долараў. Для таго, каб прыцягнуць пакупніка, на этапе залівання падмурка дома прапануюцца цэны каля 1000 долараў за квадратны метр пры 100-працэнтнай аплаце кватэры. З ростам завершанасці аб'екта расце і кошт за квадратны метр.

Усё часцей можна сустрэць у двух- і трохпакаёвых кватэрах цану 940-980 долараў за квадратны метр. Аднак растэрміноўка аплаты па такіх кватэрах, як правіла, адсутнічае.

Найбольш страцілі ў цане дарагія новабудоўлі класа «Прэстыж». Сярэдні кошт квадратнага метра ў такіх супердамах знізіўся на 7% і склаў 1840 долараў. Мінімальныя аб'ёмы продажу кватэр гэтай катэгорыі сёлета на працягу ўсяго сезона прымушаюць забудоўшчыкаў самага элітнага з даступных для набыцця класа жылля праводзіць акцыі па зніжэнні кошту квадратнага метра ажно да 1250 долараў за квадратны метр. Улічваючы вялікія плошчы кватэр гэтага класа, выніковы кошт аказваецца не такі ўжо і маленькі: нават пры цане 1250 долараў за «квадрат» двухпакаёвая кватэра плошчай 80 квадратных метраў абыдзецца пакупніку ў сур'ёзныя 100 тысяч долараў.

Патанненне з запасам

З пачатку года кошты рэальных здзелак з кватэрамі на другасным рынку «згубілі» нават менш, чым па цэнніках прапановы — 15% супраць 18% адпаведна. На думку **намесніка дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святланы КУДЗЕЛКІ**, падобная з'ява абумоўлена тым, што прадаўцы да канца года сталі ўжо першапачаткова выстаўляць больш рэальную цану на свае кватэры. Сёння ўласнікі разумеюць, што завышаная цана кватэры адпужвае патэнцыйных пакупнікоў. А ў выніку кватэра можа зусім не карыстацца попытам да тых часоў, пакуль цана прапановы не будзе зніжана.

Лістападаўскі трэнд на зніжэнне кошту кватэр усіх катэгорый застаецца актуальным і надалей. Аналіз зарэгістраваных пераходаў правоў уласнасці на жыллёвую нерухомасць у лістападзе паказвае, што сярэдні кошт квадратнага метра знізіўся на 3% да ўзроўню 1240 долараў. Гэта датычыцца ўсіх рэалізаваных у лістападзе кватэр. А самыя папулярныя ў пакупнікоў жылыя памяшканні «стандартных спажывецкіх якасцей» у лістападзе рэалізоўваліся па сярэдніх цэнах 1265 долараў за квадратны метр для аднапакаёвых, 1160 долараў за квадратны метр для двухпакаёвых і 1130 долараў за «квадрат» для трохпакаёвых кватэр.

«У сітуацыі няхай не дынамічнага, але ўсё ж пастаяннага зніжэння коштаў вызначэнне аб'ектыўнай цаны для кватэры дазваляе прадаўцу скараціць час яе экспазіцыі і такім чынам знізіць грашовыя страты ад пастаяннай карэкціроўкі цэннікаў», — тлумачыць Святлана Кудзелка. «Чым больш прывабная цана на кватэру ўжо сёння, тым больш шанцаў, што менавіта яе выберуць сярод багацця прапаноў», — упэўнена эксперт.

Восеньскі рэкорд прапановы

«Разам са зніжэннем коштаў аб'ём прапановы кватэр на рынку працягвае павялічвацца», — канстатуюць сітуацыю на сталічным рынку эксперты жыллёвай нерухомасці. Пікавыя значэнні аб'ёму прапановы кватэр сёлета былі зафіксаваныя ў жніўні. Лістападаўскі аб'ём прапановы не дацягнуў да яго толькі 5%. Але ў той жа час гэта не перашкодзіла лістападу паставіць свой асабісты «восеньскі» рэкорд: практычна 8900 кватэр у агульным спісе, што на 25% больш за ўзровень пачатку гэтага года.

Шырокі аб'ём прапановы кватэр і даволі жорсткія патрабаванні пакупнікоў (яны сур'ёзна павялічыліся за апошняе паўгоддзе) у кожным канкрэтным выпадку істотна звужаюць кола пошуку прыдатных варыянтаў жылля. «І тады пакупнікам важна не ўпусціць «сваю» кватэру, а прадаўцам — «свайго» пакупніка», — раіць Святлана Іванаўна. Яна лічыць, што ва ўмовах адсутнасці змяненняў у эканамічнай сітуацыі ў краіне і абмежаванасці даступных крэдытных рэсурсаў прадаўцы павінны ставіцца больш лаяльна да прапанаванага гандлю.

Пошук танных варыянтаў

Сёння эксперты адзначаюць, што няпростая эканамічная сітуацыя ў краіне прымусіла пакупнікоў пераарыентавацца на максімальна таннае жыллё. Падобная накіраванасць попыту адбілася і на продажах больш дарагіх кватэр. Так, паводле слоў Святланы Кудзелкі, у лістападзе на 10% менш было прададзена кватэр, «гатовых да пражывання», што маюць у сваім актыве свежы якасны рамонт і базавы набор мэблі і бытавой тэхнікі. «Аднак варта адзначыць, што па якасці прададзеныя кватэры былі істотна вышэйшыя за ўзровень кватэр кастрычніка, гэта наглядна дэманструе ўзрослыя якасныя патрабаванні пакупнікоў», — тлумачыць спецыяліст.

Па выніках лістапада, сярэдні кошт квадратнага метра ў «гатовых да пражывання» кватэрах склаў 1500 долараў, у тым ліку: у аднапакаёвых кватэрах — 1555 долараў, двухпакаёвых — 1430 долараў, трохпакаёвых — 1445 долараў.

Агульнай тэндэнцыяй гэтай восені можна назваць арыентацыю пакупнікоў на кватэры стандартных спажывецкіх якасцей па максімальна бюджэтных цэнах. Пры гэтым адкрыта «неліквіднае» па стане жыллё, якое ад будучага ўласніка запатрабуе значных выдаткаў на правядзенне рамонту, зацікавіць толькі пакупнікоў, нацэленых на куплю жылля па самых мінімальных цэнах. «А сёння патэнцыйныя пакупнікі навучыліся лічыць кожны артыкул выдаткаў, няхай гэта будзе правядзенне рамонту альбо проста купля мэблі, і імкнуцца знайсці максімальна збалансаваны па суадносінах «кошт/якасць» варыянт», — кажа Святлана Кудзелка. Акрамя таго, актуальным сярод жыхароў сталіцы застаецца і рашэнне кватэрнага пытання з дапамогай размену і абмену жылля на кватэру большай плошчы. Такія аперацыі патрабуюць невялікага ўкладання сродкаў, а структура рынку дазваляе выбраць найбольш аптымальны для пакупніка варыянт.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ НЕ ПАЦВЕРДЖАНА

Дзяржстандарт забараніў увоз і абарачэнне на рынку рэспублікі асобных найменняў свяцільняў

Небяспечная прадукцыя выяўленая Гродзенскай абласной інспекцыяй, а таксама Інспекцыяй па Мінскай вобласці і горадзе Мінску.

У ТАА «БПЛэлектра» ў Лідзе рэалізоўваліся столевыя свяцільні НДА 106 «Плутон» гандлёвай маркі «TDM ELECTRIC» турэцкай вытворчасці, у якіх не была забяспечана абарона спажыўцоў ад пашкоджання электрычным токам, чаго патрабуе тэхнічны рэгламент Мытнага саюза і дзяржаўны стандарт на гэтую прадукцыю.

Забарона на рэалізацыю свяцільняў выдадзена і сталічнаму гандлёваму аб'екту ЗАТ «Ніпекс». У прэс-службе Дзяржстандарта паведамілі, што ў люстрах гандлёвай маркі «Тэхналюкс» расійскай вытворчасці выяўлена неадпаведнасць патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Электрамагнітная сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў» па стварэнні электрамагнітных перашкод. Зафіксавана перавышэнне ўстаноўленых значэнняў гарманічных складнікаў току, што можа стварыць перашкоды для работы іншага электрычнага, кантрольна-вымяральнага абсталявання, выклікаць збоі электрасувязі і выхад лямпаў са строю.

На гэтыя віды прадукцыі на тэрыторыі рэспублікі спынена дзеянне выдадзеных сертыфікатаў адпаведнасці Мытнага саюза.

Гатуем стравы з «цвіллю» і «кішэчнай палачкай»!

За тры апошнія месяцы больш як на 10 найменняў прыпраў і спецый была выдадзена забарона на ўвоз і абарачэнне на рынку рэспублікі. Таксама спынена або прыпынена дзеянне дэкларацый аб адпаведнасці на гэтыя тавары, якія «пацвярджаюць» іх адпаведнасць патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы харчовай прадукцыі» (ТР МС 021/2011). Небяспечныя прыправы былі выяўлены Гомельскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласнымі інспекцыямі Дзяржстандарта ў ходзе наглядных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў гандлёвых аб'ектах рэгіёнаў.

Небяспечнай прадукцыяй прызнаны куркума, кары, прыправа для рыбы і шашлыка ад «Вкусмастера», кары ад Pargy, заправа для свініны «Прыпраўка», заправа «Degusta» з кропам ад Vitpol, хмелі-сунелі «7 страў», чорны молаты перац «Прыпраўка» і «Эстэтыка смаку», зробленыя ў Польшчы, Расіі, Украіне. Імпартавалі іх у Рэспубліку Беларусь сталічныя ТДА «Сатурн-2», ПП «Прасперыці», ТАА «Авалонгандаль», ТАА «Дабрада».

У прэс-службе Дзяржстандарта адзначылі, што практычна ва ўсіх прыправах выяўлены неадпаведнасці патрабаванням па мікрабіялагічных паказчыках: значнае перавышэнне нормаў па колькасці мікраарганізмаў, цвілі і бактэрый групы кішэчнай палачкі.

У ліку прычын выяўленых парушэнняў у Дзяржстандарце называюць якасць сыравіны, што пастаўляецца ў асноўным з краін Паўднёва-Усходняй Азіі, недастатковы ўзровень санітарна-гігіенічнага стану вытворчасці і схем кантролю мікрабіялагічных паказчыкаў.

— Тыя імпарцёры, у якіх наладжаны ўстойлівыя сувязі з вытворцамі прыпраў і спецый і маюць прамыя кантракты на пастаўку гэтай прадукцыі, неадкладна адрэагавалі на выдадзеныя прадпісанні, імкнучыся ў самыя кароткія тэрміны ліквідаваць парушэнні, — адзначае **начальнік аддзела дзяржаўнага нагляду і кантролю Дзяржстандарта Ігар БУСЕЛЬ**. — Яны інфармуюць камітэт аб укараненні працэдур па абеззараджванні сыравіны, арганізацыі ўваходнага кантролю партый прыпраў, якія паступаюць на адпаведнасць мікрабіялагічных паказчыках у акрэдытаваных выпрабавальных лабараторыях.

Па выніках прымянення прадпісанняў аб забароне ўвозу і абарачэння небяспечных прыпраў і спецый, а таксама аб спыненні (прыпыненні) дзеяння на тэрыторыі рэспублікі дэкларацый аб адпаведнасці на іх была абмежавана рэалізацыя прадукцыі на суму больш як 1 млрд рублёў.

Дар'я ШОЦІК.

З моманту ўступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 48 «Аб мерах па забеспячэнні дзяржаўнага кантролю (нагляду) за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў» Дзяржстандартам выдадзены 202 прадпісанні аб выманні з абарачэння небяспечнай прадукцыі, забаронены ўвоз і абарачэнне 248 найменняў небяспечнай прадукцыі, на 190 найменняў спажывецкіх тавараў спынена (прыпынена) дзеянне на тэрыторыі рэспублікі дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці Мытнага саюза.

— Гэтыя захады з'яўляюцца вельмі дзейснымі, бо дазваляюць абмежаваць паступленне значных патокаў неадпаведнай прадукцыі, — падкрэслівае Ігар БУСЕЛЬ. — Апроч гэтага, паміж наглядными органамі рэспублікі, інспекцыямі Дзяржстандарта наладжаны эфектыўны абмен інфармацыяй аб неадпаведнай прадукцыі. Мы накіроўваем такую інфармацыю ў Еўразійскую эканамічную камісію і ўпаўнаважаныя органы іншых дзяржаў — членаў ЕАЭС.

■ На слыху

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ ПАД НАГЛЯДАМ:

Мінгандлю наводзіць парадак у інтэрнэце

Што будзе ў Беларусі з продажам алкаголю ў сеціве, ці з'явіцца падатак на куплю ў замежных інтэрнэт-крамах і навошта Міністэрства гандлю цікавіцца сацыяльнымі сеткамі? Паспрабуем разабрацца.

БЕЛАРУСКІЯ ТАВАРЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Па словах **намесніка міністра гандлю Ірыны НАРКЕВІЧ**, Беларусь актыўна працуе над прасоўваннем айчынных тавараў на буйных кітайскіх інтэрнэт-пляцоўках. Вядома, што частка прадукцыі «Беллегпрама» ўжо прадаецца праз пляцоўкі «Аліэкспрэс» — аптовы інтэрнэт-гіпермаркет. Акрамя таго, ужо ёсць дамоўленасці з буйнымі кітайскімі пляцоўкамі пра іх прыезд у Беларусь з мэтай прасоўвання айчынных тавараў. У гэтым зацікаўлены не толькі беларусы, але і кітайцы, таму што пасля пэўнага часу актыўнай экспансіі кітайскай прадукцыі на сусветныя рынкі яны маюць патрэбу ў якасным замежным тавары сярэдняга цэнавага сегмента. Беларуская прадукцыя якраз упісваецца ў гэтыя патрабаванні. Таксама варта заўважыць, што ў апошні час у Беларусі актыўна развіваецца замежны брэндавы гандаль.

Між тым, у краіне ўжо сур'ёзна падумваюць і аб увядзенні збору на куплю ў замежных інтэрнэт-крамах. Як адзначае Ірына Наркевіч, цяпер самае правільнае — вырашаць гэтае пытанне на ўзроўні Еўразійскай эканамічнай камісіі. Але калі ЕЭК будзе марудзіць, то Беларусь пойдзе хутчэй. Тэма падатку на куплю ў замежных інтэрнэт-крамах не нацыянальная — яна тычыцца ўсіх краін — удзельніц ЕАЭС.

РЭКЛАМА НА КАНТРОЛІ

Сацыяльныя сеткі напоўнены рэкламай, і таму Міністэрства гандлю не змагло пакінуць гэта незаўважаным. Ірына Наркевіч тлумачыць, што гандаль інтэрнэт-крам часта перацякае на сацыяльныя платформы, а рэкламуюцца там не заўсёды легальныя і якасныя тавары. Таксама, паводле слоў намесніка міністра, пад асаблівым кантролем знаходзіцца неэтычная рэклама. Напрыклад, начныя клубы пачалі дэманстраваць сексуальныя сцэны, парнаграфічныя выявы, якія парушаюць нормы маральнасці. За гэтым таксама будуць сачыць. А часам прадпрымальныя людзі спрабуюць збыць і забароненыя да продажу ў інтэрнэце тавары, напрыклад алкаголь. Дарэчы дазволу на інтэрнэт-продаж алкагольных напояў у Беларусі не будзе. Паводле слоў намесніка міністра, пакуль гэта немагчыма. Вытворцы з ініцыятывай не выступаюць, больш за тое — катэгарычна супраць гэтага. Пытанне не падтрымліваюць і праваахоўныя органы сумесна з Міністэрствам аховы здароўя. Для такога гандлю неабходна, каб у інтэрнэце ўжо цяпер не было «шэрага» і «чорнага» тавару. Акрамя таго, Ірына Наркевіч выказала некаторую асцярогу ў дачыненні да прадаўцоў прадуктаў харчавання, якія сёння гандлююць праз інтэрнэт. Ёсць рызыка, што паралельна са звычайнай ежай яны пачнуць рэалізоўваць і алкагольныя напоі. Аднак такіх выпадкаў пакуль што не было.

ТРЫМАЦЬ АДКАЗ

Але некаторым прадаўцам давялося трымаць адказ. Па выніках праверак у краіне сёлета за 9 месяцаў прыпынялася работа 35 інтэрнэт-крам і 5 інфармацыйных рэсурсаў. Аднак пратаколы, штрафы і закрыццё былі далёка не ва ўсіх выпадках — гэта крайняя мера. Пытанні вырашаліся таксама прадпісаннямі. Іх вынесена 90. Увогуле, у студзені—верасні было складзена 130 пратаколаў, выпісана каля 50 млн рублёў штрафу, што ў 2,5 раза больш, чым у мінулым годзе.

«Летась у нас стаў развівацца продаж лекаў фізічнымі асобамі. Разам з Міністэрствам аховы здароўя мы выявілі, што менавіта на інфармацыйных пляцоўках у асноўным прасоўваецца гэтая тэма. Таму была прыпынена іх работа», — патлумачыла намеснік міністра.

З'ЯВІЦЦА «БЕЛЫ СПІС» ПРАДАЎЦОЎ ЭЛЕКТРОНІКІ?

У краіне плануецца правесці добраахвотную атэстацыю інтэрнэт-крам электронікі і бытавой тэхнікі. Для гэтага да іх будуць распрацоўваць спецыяльныя патрабаванні. Усё будзе рабіцца і абмяркоўвацца публічна. Арганізатары лічаць, што гэта неабходна ў першую чаргу спажыўцу. Пакупнік павінен разумець, што перад ім інтэрнэт-крама, якая выконвае заканадаўства, нясе адказнасць перад грамадзянінам і дзяржавай. Такім чынам, будзе змяншацца рызыка трапіць у афёры так званых прадпрымальнікаў-аднадзёнак, якія проста зарэгістравалі сайт і прыйшлі на рынак, каб атрымаць прыбытак у момант павышанага попыту, не клапоцячыся пры гэтым аб якасці тавару.

Атэстацыя стане адным з этапаў праекта «Black & Gray», запушчанага з мэтай скарачэння незаконнага абароту імпартнай камп'ютарнай тэхнікі, мабільных тэлефонаў і іншай бытавой электронікі. Праект разбіты на 5 этапаў, першы з якіх — інтэрнэт-гандаль. Зараз у цэнтралізаваную базу сабрана інфармацыя пра больш за 280 інтэрнэт-крам. Для папярэджання парушэнняў на адрас уласнікаў накіраваны рэкамендацыі па выкананні заканадаўства Беларусі, якое рэгулюе праваадносіны ў сферы інтэрнэт-гандлю, а таксама растлумачана юрыдычная адказнасць за парушэнне дзеючых правілаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Расклад на заўтра

Выкарыстаць магчымасці

Выхаванцы інтэрнатных установ за адукацыяй не гоняцца?

За 2010—2015 гады ў беларускія сем'і было ўладкавана на выхаванне больш як 12,6 тысячы дзяцей-сірот. За той жа час колькасць дзіцячых дамоў сямейнага тыпу павялічылася ў краіне ў 2,5 раза (з 95 да 243), а колькасць іх выхаванцаў — у 2,6 раза (з 622 да 1655). Развіццё сямейных формаў уладкавання дзяцей-сірот стала адным з галоўных напрамкаў работы па абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей у нашай краіне. Пра гэта на калегіі Міністэрства адукацыі паведаміла начальнік упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ведамства Марыя САРОТНІК.

Сёння ў краіне налічваецца 22 131 дзіця-сірата, з іх 4389 дзяцей з'яўляюцца выхаванцамі дзіцячых інтэрнатных устаноў, яшчэ 508 выхоўваюцца ў дзіцячых вёсках (гарадках), дзе створаны ўмовы пражывання, максімальна набліжаныя да хатніх.

Сетку дзіцячых інтэрнатных устаноў краіны складаюць 9 дамоў дзіцяці, якія функцыянуюць у сістэме аховы здароўя, 10 дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця ў сістэме Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і 36 устаноў у сістэме адукацыі: 20 дзіцячых дамоў, 4 школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, 6 дапаможных школ-інтэрнатаў, укамплектаваных дзецьмі-сіротамі, 5 дзіцячых вёсак і 1 дзіцячы гарадок.

Разам з тым спецыяліст засяродзіла ўвагу на наступным факце: колькасць выхаванцаў дзіцячых інтэрнатных устаноў, якія паступаюць ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, змяншаецца. Па аператыўнай інфармацыі, атрыманай з рэгіёнаў, студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў і навучэнцамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па выніках уступнай кампаніі 2015 года сталі толькі 6,7% ад агульнай колькасці выпускнікоў інтэрнатных устаноў, навучэнцамі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі — 29,6%.

— Старшакласнікі павінны бачыць магчымасць сваёй паспяховай рэалізацыі праз рабочыя спецыяльнасці. А для гэтага прафарыентацыйная работа павінна стаць абавязковым напрамкам працы ў шосты школьны дзень і ажыццяўляцца з улікам запытаў і патрэб навучэнцаў, — заваставрыла ўвагу прысутных начальнік упраўлення.

У сувязі з гэтым неабходна наладзіць кантакты дзіцячых інтэрнатных устаноў з установамі прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, каб задзейнічаць іх рэсурсы ў прафарыентацыі. Дарэчы, па выніках 2015—2016 навучальнага года з дзіцячых інтэрнатных устаноў сістэмы адукацыі выпускаюцца 369 выхаванцаў.

На калегіі быў агучаны намер правесці міжведамасны маніторынг постінтэрнатнага суправаджэння дзяцей-сірот, у якім будуць задзейнічаны Міністэрства адукацыі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, аблвыканкамы і Мінгарвыканкам.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Англійскі клуб

ДЖЭНТЛЬМЕНЫ ЗАПРАШАЮЦЬ...

У Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрыўся студэнцкі англійскі клуб. Ініцыятарамі яго стварэння выступілі студэнты фізічнага факультэта ВНУ. Клуб уяўляе сабой пляцоўку для ўдасканалення моўных навыкаў, практыкі гутарковай англійскай мовы, а таксама для сацыялізацыі як беларускіх, так і замежных студэнтаў.

Асаблівасць клуба — яго адкрыты фармат. Удзельнічаць у англамоўных сустрэчах могуць студэнты не толькі ўсіх факультэтаў БДУ, але і іншых сталічных ВНУ. Тут збіраецца як беларуская моладзь, так і замежнікі.

Удзельнікі сустрэч абмяркоўваюць на англійскай мове тэмы, якія тычацца адукацыі, самаадукацыі, спрачаюцца па пытаннях еўрапейскай сістэмы вышэйшай адукацыі, а таксама абменьваюцца прафесійнымі ведамі са сваімі аднагодкамі з іншых краін. І ўсё гэта без прафесійнай дапамогі педагогаў. Як правіла, сустрэча доўжыцца чатыры гадзіны з перапынкамі на чайныя паўзы.

У рамках клуба плануецца арганізоўваць таксама выступленні вядомых людзей — носьбітаў англійскай мовы. Адным з першых гасцей стаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Брус Бакнел. Сустрэчы ў клубе праходзяць штотыдзень па суботах (вул. Бабруйская 5, аўд. 309). Пачатак у 14 гадзін. Падрабязнасці можна знайсці ў сацыяльнай сетцы «УКантакце».

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

СВЯТА Ў КАНВЕРЦЕ

У трэндзе навагодніх паштовак — беларуская тэматыка

А вы ўжо рыхтуецеся даслаць сваім родным і блізкім святочныя лісты з прыемнымі пажаданнямі? Зрабіць віншаванне не толькі цёплым, але і прыгожым дапаможа штогадовы кірмаш паштовак, размешчаны на Мінскім паштамце. Сёлета тут прадстаўлена вялікая колькасць сюжэтаў картак на калядна-навагоднюю тэматыку, у тым ліку шмат новых (каля 100 сюжэтаў).

Некаторыя з іх выраблены па новай тэхналогіі. У тым ліку і дзякуючы ёй паштоўкі сталі больш прывабнымі. Кожны дызайн дэталёва распрацоўваецца з улікам паліграфічных магчымасцяў беларускіх прадпрыемстваў. Паслядрукаваныя тэхналогіі («полістызоль» белага і жоўтага колеру, цісненне фольгай серабрыстага і залацістага колеру, «тэрмаўздым», выкарыстанне матавай паперы, паперы «Лён») надаюць кожнай паштоўцы свой стыль і настрой.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Адзін з апошніх, так бы мовіць, трэндаў — паштоўкі з беларускімі матывамі. Тут і элементы арнаменту, і саламяныя кампазіцыі, і, вядома ж, віншаванні на роднай мове. Зрэшты, можна падабраць і інтэрнацыянальныя варыянты для адпраўкі замежным сябрам — на рускай і англійскай мовах.

Варыянты і коштавы дыяпазон паштовак самыя розныя. Сёлета «Белпошта» распрацавала фірменныя паштовыя карткі з мілымі зімнімі сюжэтамі, падобнымі да любімых мультфільмаў, якія вяртаюць у казачны свет дзяцінства і дораць цеплыню. Кошт такіх картак самы дэмакратычны — усяго 2 500 рублёў. Ёсць у асартыменце кірмашу і двайныя паштоўкі, і адзінарныя, і цэлыя наборы — паштоўка, аркуш паперы і канверт з маркай па Беларусі, аформленыя ў адной тэматыцы. Такія наборы будуць каштаваць 10—13 тысяч рублёў.

Над стварэннем арыгінал-макетаў паштовай прадукцыі працуюць дызайнеры, спецыялісты выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта». Яшчэ не наступілі зімовыя святы, а распрацоўшчыкі ўжо рыхтуюцца да ўвасаблення новых праектаў, якія ўбачаць свет у 2016 годзе. Сярод іх — «Нацыянальная кухня. Калдуны», «Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі. Архідэі», «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь», «Выпуск па праграме «EUROPA». «Экалогія ў Еўропе — думай, як зялёныя» і інш.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

■ Ну і ну!

ЧАЛАВЕК-КАНТЭЙНЕР

У пункце пропуску «Беняконі» работнікі праваахоўных органаў затрымалі аднаго з пасажыраў аўтобуса, які рухаўся па маршруце «Вільнюс — Воранава».

41-гадовы жыхар Гродна спрабаваў увезці з Літвы партыю гашышу. Прычым для выяўлення гэтага факту давялося прыцягваць спецыялістаў медустановы. Аказалася, што 6 кантэйнераў з 200 грамамі наркотыкаў былі схаваны ў... прамой кішцы. Як паведаміла прэс-служба Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, наркакур'ера даставілі ў міліцыю, наркотыкі перадалі супрацоўнікам мытні.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■

КАНКУРЭНЦЫЯ, АДНАК...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярод зарэгістраваных беспрацоўных колькасць грамадзян, якія не працуюць працяглы тэрмін, павялічылася ў 3 разы. Кожны чацвёрты беспрацоўны — старэйшы за 50 гадоў. Кожны трэці звярнуўся ў службу занятасці паўторна або больш за тры разы.

Сёлета, па словах **начальніка аддзела аналізу і рэгулявання рынку працы ўпраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Святланы ЛЯВОНЧЫК**, у сталічных працадаўцаў захоўваецца значны попыт на работнікаў будаўнічага профілю (арматуршчыкаў, бетоншчыкаў, маляроў, тынкоўшчыкаў, плітачнікаў-абліцоўшчыкаў), кіроўцаў аўтамабіля, мантажнікаў будаўнічых канструкцый, прадаўцоў, кантралёраў-касіраў, кухараў, слесараў-сантэхнікаў, слесараў механазборачных работ, швачак і інш.

У апошнія гады Мінск мае стабільна высокую патрэбу ў дактарах, медыцынскіх сёстрах, інжынерных кадрах розных кваліфікацый. Адзначаецца бягучая патрэба ў выхавацелях, фельчарах, фельчарах-лабарантах.

Як паведаміла «Звяздзе» **начальнік аддзела арганізацыі навучання грамадзян упраўлення занятасці насельніцтва Ларыса КАТКОВА**, за 11 месяцаў гэтага года раённыя аддзелы працаўладкавання сталіцы накіравалі на навучанне 1014 беспрацоўных мінчан (у 2014 годзе — 854 чалавекі). Прайшлі навучанне за гэты перыяд 873 беспрацоўныя (за аналагічны перыяд мінулага года — 675 беспрацоўных).

Атрымаць прафесію, прайсці перападрыхтоўку або аднавіць наяўныя веды могуць беспрацоўныя, зарэгістраваныя ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Навучанне ажыццяўляецца па запатрабаваных на рынку працы прафесіях (спецыяльнасцях) па адукацыйных праграмах дадатковай адукацыі дарослых і ўключае ў сябе падрыхтоўку, перападрыхтоўку і навучальныя курсы.

Сёлета горад Мінск бясплатна перанавучае беспрацоўных па 24 прафесіях (спецыяльнасцях), навучальных курсах у 10 установах адукацыі (арганізацыях).

Ларыса Каткова кажа, што ў гэтым годзе найбольшым попытам у беспрацоўных карысталася навучанне па прафесіях кладаўшчыка, кіроўцы тралейбуса, маляра, тынкоўшчыка, плітачніка-абліцоўшчыка, слесара па рамонце аўтамабіляў, манціроўшчыка шын і шынна-пнеўматычных муфт, цырульніка, майстра па манікюры, аператара кацельні, электраманцёра па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання.

За 5 месяцаў можна стаць:
— аператарам станкоў з ПУ
— кухарам
— электрагазазваршчыкам.
За 4 месяцы можна стаць:
— кіроўцам тралейбуса
— мантажнікам санітарна-тэхнічных сістэм і абсталявання.
За 8 месяцаў можна вывучыць:
— бухгалтарскі ўлік і кантроль у прамысловасці.

Таксама стабільна карыстаецца попытам навучанне па адукацыйнай праграме навучальных курсаў «Аўтаматызацыя бухгалтарскага ўліку з выкарыстаннем праграмы 1С: Бухгалтэрыя», якое дазваляе абнавіць, паглыбіць наяўныя веды, навыкі, вывучыць новыя тэхналогіі па дадзеным кірунку дзейнасці.

Дзяржаўнай службай занятасці падтрымліваецца і прадпрымальніцкая ініцыятыва маладых людзей. Для навучання асновам бізнесу арганізаваны навучальны курс «прадпрымальніцкая дзейнасць». За 11 месяцаў на навучанне па ім накіраваны 88 беспрацоўных маладых людзей, прайшлі навучанне 80 чалавек.

Адзін з іх, Аляксей Удальцоў, напрыклад, упэўнены, што адкрые ўласную справу. «Вядома ж, не скажу, што стаў суперспецыялістам пасля курсаў, але мне далі галоўнае: разуменне асноўных працэсаў — ад моманту рэгістрацыі кампаніі да вядзення бухгалтэрыі...»

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

ДАРЭЧЫ

Згодна з дзеючым законам аб занятасці, асобы, якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (у большасці сваёй гэта мамы малалетніх дзяцей), прызнаюцца занятымі і не могуць быць зарэгістраваны беспрацоўнымі. Як вынік — яны не могуць быць накіраваны на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў.

Законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», які быў прыняты ў першым чытанні дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў 10 снежня, дасць магчымасць атрымаць запатрабаваную прафесію такім мамам і павысіць іх канкурэнтаздольнасць на рынку працы. Згодна з ім, такія жанчыны змогуць прайсці прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку ці павышэнне кваліфікацыі на ўмовах, вызначаных для беспрацоўных. Гэта павысіць шанцы атрымаць працоўнае месца пасля выхаду з дэкрэта, забяспечыць больш хуткае ўцягванне ў працоўную дзейнасць.

VAЖНА ВЕДАЦЬ

ХТО МАЕ ПРАВА НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ?

Правам на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне маюць грамадзяне, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных, у выпадку, калі:

немагчыма падабраць падыходную працу праз адсутнасць у беспрацоўнага неабходнай кваліфікацыі (спецыяльнасці);

неабходна змяніць прафесію (спецыяльнасць, род заняткаў) у сувязі з адсутнасцю працы, якая адпавядае наяўным у беспрацоўнага прафесійным навыкам;

беспрацоўным страчана здольнасць або ўзніклі супрацьпаказанні да выканання працы па ранейшай прафесіі (спецыяльнасці).

Рэгістрацыя у якасці беспрацоўных ажыццяўляецца па месцы жыхарства органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне пры асабістым звароце. Пры рэгістрацыі неабходна прад'явіць пашпарт, працоўную кніжку, дакумент аб адукацыі і іншыя дакументы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі.

Пры накіраванні на навучанне беспрацоўным гарантаваны бясплатны медыцынскі агляд, выплата стыпендыі, аказанне матэрыяльнай дапамогі ў перыяд навучання ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Грамадзянам, якія паспяхова скончылі навучанне, выдаецца дакумент установленага ўзору з прысваенне кваліфікацыі.

КАНТАКТ
№ 6 (34)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»
Сумесны выпуск з РУП «Белпошта»

■ Ведай нашых!

«Звязда» перамагла ў конкурсе на самы лепшы матэрыял пра пошту

Журналісты працуюць не за ўзнагароды і званні. І ўсё-такі прыемна, калі іх працу адзначаюць. І яшчэ шматкроць прыемней, калі яе прызнаюць найлепшай сярод работ калег. Так атрымалася ў выніку конкурсу, які «Белпошта» праводзіла сёлета з нагоды свайго 20-годдзя: скарбонка «Звязды» папоўнілася першай узнагародай у катэгорыі «Рэспубліканскія друкаваныя выданні, інфармацыйныя агенцтвы».

Журы конкурсу, якое ўзначальвала **генеральны дырэктар прадпрыемства Ірына САКСОНАВА,** высока ацаніла працу нашага выдання. А намеснік старшыні журы, **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Таццяна ГВОЗДЗЕВА** адзначыла:

— Сёлета РУП «Белпошта» адзначыла 20-годдзе. За гэтыя гады ўдалося дасягнуць многага. Рэалізаваны шэраг праектаў, арыентаваных на павышэнне якасці паслуг, якія прапаноўваюцца, і іх развіццё, уведзены новыя паслугі на базе інфармацыйных тэхналогій з улікам пажаданняў нашых кліентаў. Важна інфармаваць аб новых магчымасцях, расказваць пра дасягненні беларускай пошты. У гэтай дзейнасці велізарная роля належыць вам, паважаныя журналісты. Менавіта ад вас нашы кліенты даведваюцца пра навінкі, пра тое, як з дапамогай сучасных тэхналогій можна больш камфортна атрымаць паштовыя паслугі. Колькасць і змест матэрыялаў, якія паступілі на конкурс, — найлепшае пацвярджэнне таго, што паштовая галіна цікавая як журналістам друкаваных і электронных СМІ, так і іх чытачам і гледачам. «Белпошта» будзе і ў далейшым радаваць сваімі поспехамі і паслугамі. Магу сказаць толькі цёплыя словы ў адрас рэдакцый і журналістаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у творчым спаборніцтве.

Віншуем Дзіяну Серадзюк, журналістку газеты «Звязда», з заслужанай перамогай, дзякуем за жывую цікавасць аўтара да пошты, плённае супрацоўніцтва і жадаем творчых поспехаў!

Віншуем калектыў Выдавецкага дома «Звязда» з надыходзячымі Калядамі і Новым 2016 годам! Хай поспех спадарожнічае ўсім пачынанням вашай прафесійнай каманды. Зычым працвітання і дабрабыту, новых сумесных праектаў і невычэрпнай крыніцы крэатыўных ідэй!

ВЫБІРАЙ — НЕ ХАЧУ

ПЯЦЬ СПОСАБАЎ ПАВІНШАВАЦЬ БЛІЗКІХ СА СВЯТАМІ

«Да чаго тэхналогіі дайшлі!» — здзіўляўся герой любімага многімі мультфільма паштальён Печкін. Цікава, што б ён сказаў, калі працаваў бы на сучаснай беларускай пошце? Яе функцыянал пашырыўся настолькі, што адных толькі спосабаў павіншаваць дарагіх людзей і падрыхтавацца да свят знойдзецца як мінімум пяць. Мяркуйце самі.

Для хуткасці — EMS Belpost

Што найбольш каштоўнае ў рытме сучаснага жыцця? Правільна, хуткасць. У тым ліку і пры дастаўцы важных паведамленняў. «Белпошта» прапаноўвае актуальную паслугу «Паскораная пошта EMS Belpost». З яе дапамогай адпраўленне будзе дастаўлена па прынцыпе «ад дзвярэй да дзвярэй» не толькі ў любы пункт Беларусі, але і па ўсім свеце. Разгалінаваная сетка аддзяленняў паштовай сувязі па ўсёй краіне, вялікі аўтапарк, супрацоўніцтва з Кааператывам EMS дазваляюць зрабіць гэта хутка, якасна і ў тэрмін. Пры гэтым магчымая дастаўка на працягу дня на наступны працоўны дзень; да 10 гадзін на наступны працоўны дзень; у пазначаны час на наступны працоўны дзень; у дзень прыёму. Апроч таго, можна атрымаць апавяшчэнне аб дастаўцы, здзейсніць накладзены плацеж, паўторную дастаўку і ўручэнне па дадатковым адрасе.

Скарыстаўшыся паслугай па перасылцы міжнароднай паскоранай пошты, запэўніваюць на прадпрыемстве, кліенты атрымаюць сэрвіс сусветнага ўзроўню, змогуць застрахаваць адпраўленне і, пры неабходнасці, «Белпошта» забяспечыць бясплатнае захоўванне адпраўлення з таварным укладаннем на складзе часовага захоўвання. З дапамогай сістэмы сачэння на сайце www.belpost.by можна кантраляваць праходжанне адпраўленняў з моманту іх прыёму да моманту ўручэння.

Дзе атрымаць паслугу «Паскораная пошта EMS Belpost»? Ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі і ў спецыяльных падраздзяленнях «Бізнес-пошта». Скарыстацца паслугай можна таксама дома або ў офісе, выклікаўшы паштовага кур'ера, які на месцы спакуе і ўзважыць адпраўленне, разлічыць кошт паслуг, а таксама аформіць усе неабходныя суправаджальныя дакументы.

Па атмасферу — у Shop.belpost.by

Shop.belpost.by — гэта эксклюзіўная паштовая інтэрнэт-крама беларускіх тавараў. Акцэнт на айчынных вытворцах зроблены невыпадкова: многія беларускія брэнды цэняцца сваёй высокай якасцю і даступным узроўнем цэн. Прадпрыемства ўжо супрацоўнічае больш як са 150 вытворцамі. Сярод іх такія вядомыя кампаніі, як «Алеся», «Белпласт», «Брэсцкі панчошны камбінат», «Віцьба», «Галантэя», «Світанак», «Шклозавод «Нёман», «Элема» і многія іншыя. У інтэрнэт-краме прадстаўлены шырокі асартымент тавараў, якія дапамогуць падрыхтавацца да свят і стварыць утульную атмасферу Каляд і Новага года. Тут можна набыць віншавальныя паштоўкі, маркі, цацкі, адзенне, абутак, бытавую тэхніку, посуд, пасцельную бялізну, парфумерыю і інш. А каб аператыўна атрымаць заказ, можна скарыстацца паслугай «Паштовы кур'ер».

Нам з вамі «Па дарозе»!

З дапамогай паштовага адпраўлення можна перадаць родным ці знаёмым падарункі да Каляд і Новага года (не забароненыя да перасылкі ва ўнутраных паштовых адпраўленнях). Гэта выдатная магчымасць сваякам і знаёмым тэрмінова перадаць нешта патрэбнае і важнае на значную адлегласць.

Прапанова беларускай пошты — гарантыя дастаўкі і ўручэння адпраўлення менавіта адрасату. Паслуга прадастаўляецца па схеме «дакладны час адпраўкі і дакладны час прыбыцця» па даступных тарыфах (з раскладам паштовага транспарту можна азнаёміцца на сайце прадпрыемства ў раздзеле «Паслугі»).

Адпраўленне «Па дарозе» прымаецца і выдаецца ў вылучаных аддзяленнях паштовай сувязі Беларусі. Для зручнасці кліентаў такія аддзяленні, як правіла, размяшчаюцца паблізу чыгуначных і аўтобусных вакзалаў. Напрыклад, у Мінску прыём і выдача адпраўленняў ажыццяўляецца ў аддзяленні паштовай сувязі №60 на вул. Вакзальная, 22. Пасылка, вага якой не павінна перавышаць 20 кг, пламбіруецца ў прысутнасці адпраўніка і ўскрываецца ў прысутнасці адрасата. Дарэчы, аплаціць паслугу «Па шляху» можна як гатоўкай, так і банкаўскай пластыкавай карткай.

«Аплачаная дастаўка ў вячэрні час»

Аднымі з найбольш запатрабаваных паслуг сярод кліентаў сталі адпраўленні лінейкі «Камфорт» (лісты і пасылкі), пры перасылцы якіх атрымальніку даецца магчымасць выбраць час і ўдакладніць адрас уручэння, а адпраўніку ў дзень уручэння ліста адпраўляецца SMS-апавяшчэнне аб атрыманні. Сэрвіс дазволіць сэканоміць час і атрымаць паштовыя адпраўленні, не выходзячы з дому.

Новы сэрвіс «Аплачаная дастаўка ў вячэрні час» дазваляе кліенту даслаць рэгістраванае паштовае адпраўленне, заплаціўшы пры гэтым за дастаўку ў перыяд з 19.00 да 21.00. Інфармацыя пра дату ўручэння паштовага адпраўлення паступіць адпраўніку на нумар мабільнага тэлефона SMS-паведамленнем.

Netліст адпраўлялі?

З дапамогай адпраўлення netліст вы можаце аператыўна і арыгінальна павіншаваць блізкага чалавека з Калядамі і Новым годам або іншай падзеяй. Яно спалучае магчымасці электроннай і традыцыйнай пошты. Апроч таго, netліст дазваляе пераслаць інфармацыю ў максімальна кароткія тэрміны.

Адправіць такі ліст можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі ў фізічнай ці электроннай форме. Для большай зручнасці адпраўленні netліст могуць перасылаць з паведамленнем адпраўніка аб яго ўручэнні; з дастаўкай у тэрмін, названы адпраўнікам; з дастаўкай на двайной паштоўцы.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

■ Навінка

БЕЗ ЧАРГІ І АПЕРАТАРА:

ЯК ПРАЦУЮЦЬ «РАЗУМНЫЯ» ТЭРМІНАЛЫ

Нядаўна ў сталічных аддзяленнях паштовай сувязі сталі з'яўляцца новыя тэрміналы, з дапамогай якіх можна самастойна адпраўляць карэспандэнцыю вагой да двух кілаграмаў. «Звязда» апрабавала новую прыладу самаабслугоўвання.

— Тэрміналы SMART-post мы ўстанаўліваем для зручнасці нашых кліентаў, каб яны маглі з камфортам і без чаргі дасылаць свае адпраўленні, — расказвае **начальнік упраўлення паштовых і фінансавых паслуг Алена ДРАЗДОВІЧ.**

Фота Аўгена ПЯСЕЦКАГА.

Першы тэрмінал самаабслугоўвання ўсталявалі на мінскім Галоўпаштамце яшчэ сёлета ў чэрвені, але паўнавартаснае выкарыстанне такіх прылад пачынаецца толькі цяпер. За гэты час па Мінску ўжо паставілі 40 тэрміналаў у розных, пераважна буйных, аддзяленнях паштовай сувязі. Пакуль што яшчэ спецыялісты адсочваюць водгукі кліентаў, але плануецца, што неўзабаве такія апараты з'явяцца і ў іншых рэгіёнах.

Новы сэрвіс уяўляе сабой прыстасаванне, аснашчанае вагай, прынтарам, накапляльнік для захоўвання паштовых адпраўленняў з праграмным забеспячэннем, якое звязана з плацежна-даведачным тэрміналам.

Усё афармленне пісьма ўкладаецца ў пяць немудрагелістых крокаў. Начальнік упраўлення дэманструе нам, як працуе навінка.

— Па-першае, неабходна ліст пакласці на вагу, — гаворыць Алена Драздовіч і кладзе канверт на паверхню прылады. Тут жа высвечваецца яго вага, і мы працягваем аперацыю.

На экране плацежна-даведачнага тэрмінала тым часам трэба выбраць рэжым: «Паштовыя паслугі» і «Прыём заказнога пісьма». Далей камп'ютар папросіць указаць адпраўніка: фізічную ці юрыдычную асобу. Паколькі мы здзяйсняем індывідуальную адпраўку, то, як фізічная асоба, павінны ўказаць звесткі пра сябе: прозвішча, імя, імя па бацьку, а таксама адрасы — спачатку адпраўніка, пасля атрымальніка. Усё тое самае, што мы звычайна пішам на канвертах, цяпер набіраем на экране тэрмінала.

— Калі 10 лістоў трэба даслаць, то нямала ўводзіць давядзецца, — заўважае мужчына, які назірае за дэманстрацыяй. Начальнік упраўлення пагаджаецца, але ж ці менш нам даводзіцца пісаць, калі мы пазначаем адрасы ўручную?

Далей неабходна выбраць спосаб аплаты. Разлічвацца за такую паслугу можна як наяўнымі грашыма праз купюрапрымальнік, так і плацежнай карткай. Алена Драздовіч выбірае апошні варыянт і аплачвае аперацыю. Дарэчы, каштуе яна столькі ж, колькі тая самая паслуга пры апрацоўцы аператарам: да 20 грамаў — 13200 рублёў, а пасля за кожны наступны грам налічваецца 300 рублёў.

Заўважаю, што купюрапрымальнік разлічаны на асігнацыі наміналам ад адной да 200 тысяч рублёў. Рэшты аўтамат не выдае.

— Як жа можна ўнесці 200 рублёў? — запытваю ў Алены Драздовіч.

— Неабходна ўнесці 14000, а астатняя сума залічваецца на мабільны тэлефон. Пры афармленні ліста на тэрмінале адкрываецца дадатковае акенца, дзе неабходна ўвесці нумар тэлефона, і рэшта залічваецца на яго.

Пасля ўвядзення рэквізітаў і афармлення ліста раздрукоўваюцца квітанцыя і адрасны ярлык, які трэба наклеіць на канверт. На гэтым ярлыку ўказваецца штрых-код, пры дапамозе якога можна адсочваць шлях ліста ў анлайн-рэжыме на сайце www.belpost.by альбо праз тэрмінал. Цяпер ліст гатовы да адпраўкі і яго трэба ўкінуць у накапляльнік для захоўвання адпраўленняў.

— Тэрміны перасылкі такіх адпраўленняў не адрозніваюцца ад тых, якія афармляе аператар, — заўважае Алена Драздовіч.

Начальнік упраўлення тлумачыць, што выемка лістоў з накапляльніка адбываецца да моманту абмену з поштай: прасцей кажучы, пакуль па заказныя лісты не прыедзе паштовая машына, якая павязе іх на сартаванне.

Дарэчы, хутка мінчане змогуць не толькі самастойна адпраўляць карэспандэнцыю, але і атрымліваць яе — пры дапамозе паштаматаў. Першую такую прыладу ўжо ўстанаўліваюць на прадпрыемстве «Мінская пошта». Сутнасць сэрвісу заключаецца ў тым, што, калі пасылка паступае на гэты тэрмінал, атрымальніку прыходзіць SMS-паведамленне з нумарам доступу да ячэйкі. Кліент прыходзіць да паштамата, выбірае паслугу «Выдача паштовага адпраўлення», уводзіць код, які прыйшоў яму на тэлефон. Пасля гэтага ячэйка адчыняецца і адпраўленне можна забіраць.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

У ІНТАРЭСАХ КЛІЕНТА

Магілёўскія паштавікі заахвочваюць насельніцтва смялей далучацца да сучасных інфармацыйных тэхналогій

У пошуках падарункаў да навагодніх свят зайшла на сайт Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта». Цяпер усім раю. У тутэйшым інтэрнэт-магазіне, які толькі летась адкрыўся, неблагі выбар тавараў. Прычым выключна беларускіх вытворцаў. Ёсць нават віншавальныя паштоўкі на роднай мове. Я ўжо маўчу пра святочныя наборы на любы густ. І зніжкі таксама ёсць. Аж да 50%.

— Мы клапоцімся, каб наш кліент быў усім задаволены, — адзначае **дырэктар Магілёўскага філіяла «Белпошты» Алена КОТАВА.** — У нашым каталогу прадстаўлена прадукцыя каля 100 беларускіх вытворцаў. Вопратка, трыкатажныя вырабы, дзіцячыя цацкі, галантарэя, прадукты харчавання, нават кандытарскія вырабы — гэта ўсё можна заказаць праз наш інтэрнэт-магазін. А да 22 снежня ва ўсіх аддзяленнях пошты можна зрабіць заказ на віншаванне Дзеда Мароза і выбраць цацку, падушку або боцік у выглядзе сімвала года — малпы. Попыт такі, што нават робім дадатковыя заказы.

— Сёння пошта ўяўляе сабой шматфункцыянальны сэрвісны цэнтр. Цікава, наколькі запатрабаваны ў насельніцтва паслугі новага часу? Або людзі па-ранейшаму прыходзяць заплаціць за камунальныя паслугі, атрымаць пенсію і купіць паштоўку?

— Жыццё не стаіць на месцы. Мы даём магчымасць далучыцца да сучасных паштовых паслуг, якія прапаноўваюцца ва ўсім свеце. Пра тое, што мы не адарваны ад, як той казаў, цывілізацыі, можна меркаваць па росце попыту на перадавыя паслугі. Юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі запатрабаваны паслугі ўнутранай паскоранай пошты EMS для перасылкі дакументаў і тавараў. Гэта можна зрабіць у любым аддзяленні паштовай сувязі, падраздзяленнях «Бізнес-пошта» (яны ёсць у Магілёве, Бабруйску, Горках, Асіповічах, Крычаве), офісе і нават дома. Кліенты цікавяцца паслугамі лінейкі «Камфорт», калі адрасант мае магчымасць атрымаць SMS-паведамленне, як толькі яго ліст або пасылка дойдзе да пункта прызначэння. Для адрасата зручнасць заключаецца ў тым, што ён сам выбірае час і месца атрымання паслання. Гэты «камфорт» можна атрымліваць як асобна, так і разам. Больш становіцца ахвотных скарыстацца адпраўленнямі «1 клас».

— А яшчэ праз вас можна атрымаць даведку аб наяўнасці маёмасці, што таксама зручна...

— Сапраўды, мы прадастаўляем звесткі аб правах і абмежаваннях правоў на зямельныя ўчасткі, капітальныя збудаванні, ізаляваныя памяшканні і гэтак далей. Летась мы далі магчымасць нашым кліентам далучыцца да дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў з дапамогай ААІС (агульнадзяржаўная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма). Наогул пералік паслуг у нас вялікі, у тым ліку і па страхаванні. Можна, напрыклад, заключыць дагавор абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў, аплаціць страхавыя паслугі і гэтак далей. Робіцца ўсё для таго, каб кліент мог атрымаць паслугу, не губляючы свайго часу. Зменшыць чэргі дапамагаюць плацежна-даведачныя тэрміналы.

— Якім чынам абслугоўваюцца жыхары аддаленых вёсак, дзе няма стацыянарных паштовых аддзяленняў?

— З мінулага года ў нас дзейнічаюць 43 перасоўныя аддзяленні паштовай сувязі. Спецыяльны транспарт мае ўвесь неабходны пералік абсталявання (спецыяльная камп'ютарная тэхніка, счытвальнік банкаўскіх плацежных карт, мадэм, электронная вага...), каб забяспечыць насельніцтва поўным спектрам паслуг. Тут можна заплаціць за камунальныя паслугі, крэдыты і мабільную сувязь, адправіць перавод, ліст ці пасылку, аформіць падпіску і страхоўку. Акрамя гэтага, мы даем магчымасць набыць розныя спажывецкія тавары, што таксама важна для людзей, якія жывуць на перыферыі. Бо там часта няма не толькі стацыянарнай пошты, але і магазіна. Звычайна машына прыпыняецца ў цэнтры населенага пункта або іншым найбольш зручным для спажыўцоў месцы.

— Сёлета «Белпошта» адзначыла сваё 20-годдзе, а ў наступным годзе такі ж юбілей святкуе Магілёўскі філіял. Чым ганарыцца ваша прадпрыемства? Наогул, наколькі яно сур'ёзнае ў маштабах вобласці?

— Філіял прадстаўлены 19 структурнымі падраздзяленнямі, дзе працуюць 3110 чалавек, з іх пятая частка — моладзь да 30 гадоў. З 1993 года званні Ганаровы сувязіст Беларусі і Ганаровы работнік сувязі Беларусі атрымалі 25 нашых супрацоўнікаў, 54 адзначаны Ганаровымі граматамі Міністэрства сувязі і інфармацыі, яшчэ 25 чалавек атрымалі падзяку. Гэта наш залаты фонд, людзі, якімі мы па праве ганарымся.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

«НА КОЛАХ» І НЕ ТОЛЬКІ

Віцебскі філіял «Белпошты» плануе адыходзячы год завяршыць з прыбыткам. Гэта вынік напружанай працы амаль што 4-тысячнага калектыву. Ці ёсць яшчэ нагоды для заслужанага гонару ў паштавікоў Прыдзвінскага краю? Што сёлета зроблена для паляпшэння абслугоўвання кліентаў? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказаў дырэктар філіяла Сяргей Эдуардавіч МАКСАК.

— Напэўна, было складана ў няпросты з фінансавага пункту гледжання год спрацаваць паспяхова. У чым сакрэт?

— У мэтазгоднай працы над павышэннем якасці абслугоўвання грамадзян, юрыдычных асоб. Паштавікі Віцебшчыны зрабілі і робяць шмат для зручнасці кліентаў. Адна з нашых прыярытэтных задач — каб яны адчувалі камфорт, знаходзячыся на пошце. Робіцца многае, каб была магчымасць хутка адправіць ліст, пасылку, грашовы перавод, аформіць падпіску на любімае выданне, купіць паштоўку. Многія на пошце аплачваюць камунальныя і іншыя паслугі. І адзначаюць, што гэта таксама не займае шмат часу. Дарэчы, цяпер і пенсію можна атрымаць у любым аддзяленні сувязі краіны.

Каб паменшыць нагрузку, у аддзяленнях паштовай сувязі функцыянуюць 8 «Бізнес-пошт». Там абслугоўваюцца толькі карпаратыўныя кліенты. Стаў больш аператыўным працэс прыёму і выдачы паштовых адпраўленняў. У тым ліку ўнутрырэспубліканскіх і міжнародных пасылак і адпраўленняў паскоранай пошты. Для гэтага былі створаныя новыя працоўныя месцы...

— Летам «Звязда» паведамляла пра тое, што ў мікрараёне Віцебска «Білева» адкрылі паштовае аддзяленне. Дзе яшчэ запланавана іх адкрыццё?

— У наступным годзе плануецца адкрыць новы аб'ект паштовай сувязі ў Полацку. А сёлета і летась адкрыліся 3 гарадскія аддзяленні: 2 — у Віцебску і 1 — у Полацку. Гэта дазволіла значна палепшыць абслугоўванне насельніцтва ў новых мікрараёнах.

Актыўна займаемся і рамонтам. У прыватнасці, сёлета выкананы значны аб'ём рамонтных работ у 5 віцебскіх аддзяленнях, у Плісе Глыбоцкага раёна, Відзах, што на Браслаўшчыне, і інш. Праводзіцца мадэрнізацыя ўчастка па апрацоўцы і абмене пошты Полацкага раённага вузла. Актыўна ўкараняем «пошту на колах», каб ніводзін чалавек не застаўся без паштовых паслуг. У вобласці на сёння функцыянуюць 42 перасоўныя аддзяленні. Яны абслугоўваюць населеныя пункты, дзе раней пошты не было.

Дбаем і пра тое, каб палегчыць працу нашых паштальёнаў, аўтаматызаваць тэхналагічны працэс аказання паслуг паштовай сувязі.

— Сяргей Эдуардавіч, як укараняюцца сучасныя паслугі і сэрвісы?

— Пашыраем іх пералік, каб ісці ў нагу з часам. Карыстаецца папулярнасцю просты ліст «1 Клас», які дастаўляецца на наступны дзень. Вельмі запатрабаванымі сталі і лісты, пасылкі лінейкі «Камфорт». Насамрэч камфортна, бо адпраўніку або атрымальніку прыйдзе паведамленне аб адпраўленні.

У стагоддзе хуткасцяў паслугі пошты ў офісе або дома таксама вельмі папулярныя сярод грамадзян і юрыдычных асоб.

Адкрыта паштовая інтэрнэт-крама. Там можна заказаць тавары прыкладна 170 беларускіх вытворцаў. І сярод іх 14 прадпрыемстваў Віцебскай вобласці. Самая новая прапанова — магчымасць адправіць паскораную пошту з накладзеным плацяжом у Расію.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ФІРМЕННЫ СТЫЛЬ СТВАРАЕ ІМІДЖ

Прадстаўнікі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» сталі лідарамі ў многіх намінацыях на 19-м Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства сярод аператараў паштовай сувязі і паштавікоў, расказвае дырэктар Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна ЦЯРЭШЧАНКА.

— Першае месца сярод паштавікоў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі заняла Любоў Банадысева, якая працуе ў 28-м аддзяленні Гомеля. На другім месцы Вольга Міронава з Рагачоўскага раёна. Таксама журы вызначыла паштальёна Святлану Сіманенку (АПС №3) і аператара Святлану Сонкіну АПС-18 Гомельскага філіяла — за практычныя і тэарэтычныя навыкі і веды адпаведна. Каманда Гомельскага філіяла не абдзелена ўвагай і ў іншых намінацыях.

Значна павялічыўся інтарэс кліентаў да дзвюх паслуг — адпраўленняў пісьмовай карэспандэнцыі «1 клас» і «Паштовы кур'ер». Скарыстаўшыся першай з іх, адрасаты атрымліваюць пошту на наступны дзень незалежна ад рэгіёна пражывання. Што тычыцца паслугі «Паштовы кур'ер», яна дазваляе адправіць дакументы або тавары з дома ці офіса. З пачатку года супрацоўнікі Гомельскага філіяла «Белпошты» амаль 50 тысяч раз выязджалі для аказання такіх паслуг, якімі часцей за ўсё карыстаюцца юрыдычныя асобы.

Восем розных акцый праведзена на працягу года. Многія з іх былі прымеркаваны да свят, насілі дабрачынны характар і мелі на мэце папулярызацыю ручнога пісьма, фарміраванне маральных якасцяў, каштоўнасці сям'і. Цяпер праводзяцца яшчэ тры акцыі да Каляд і Новага года. Дзякуючы ім выхаванцы інтэрнатаў, прытулкаў і дзіцячых дамоў, а таксама сіроты будуць падпісаны на дзіцячыя газеты і часопісы.

Сёлета ўсе 605 аб'ектаў паштовай сувязі Гомельскай вобласці былі прыведзены да адзінага фірменнага стылю. Усе супрацоўнікі пошты працуюць у элегантных сініх гальштуках. Фірменны стыль — гэта не толькі сродак фарміравання іміджу, лічаць на прадпрыемстве, ён станоўча ўплывае на стаўленне да пошты спажыўцоў.

Пасля мадэрнізацыі ў Гомелі адкрылася аддзяленне паштовай сувязі №14, дзе абслугоўваюцца больш за 7 тысяч чалавек. Ад старога будынка канца 1950-х засталіся толькі сцены. Іх умацавалі, а пад канструкцыі падвялі падмурак. Правялі водаправод, мадэрнізавалі дах, праклалі новыя камунікацыі, узвялі пандус... У выніку створаны максімальна камфортныя ўмовы як для супрацоўнікаў, так і для кліентаў. Тэрыторыя вакол прыведзена ў парадак і заасфальтавана. Ля аддзялення ёсць паркоўка з месцам для машын інвалідаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ — ПАДТРЫМКА

Святлана МЯКІШ, намеснік дырэктара Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта»:

— Паколькі сёлета ў краіне Год моладзі, то і для нас гэтая тэма была адной з прыярытэтных. Мы прынялі ў калектыў 37 маладых спецыялістаў, якія цяпер працуюць аператарамі паштовай сувязі. Урачыста пасвячаем іх у паштовыя работнікі, праводзім з імі майстар-класы, трэнінгі па правільным аказанні паслуг і псіхалагічных аспектах працы з кліентамі. Гэта скіравана на тое, каб нашы маладыя калегі развіваліся як прафесіяналы, адпавядалі сучасным патрабаванням да паштавікоў.

Са сваімі кліентамі, а магчыма, і будучымі калегамі, мы сёлета сталі часцей сустракацца ў навучальных установах. Расказваем школьнікам пра паштовыя паслугі, папулярызуем даволі распаўсюджаны цяпер сярод моладзі рух посткросінгу.

У гэтым годзе аддзяленне паштовай сувязі адкрылі ў мікрараёне «Вішнявец» абласнога цэнтра. Адзначу і важную падзею, якая на мінулым тыдні адбылася ў Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царкве. У храме прайшло рэгіянальнае гашэнне каляднай паштовай маркі з выявай славутага помніка праваслаўнага дойлідства XII стагоддзя. Маркі былі выпушчаны ў абарачэнне Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі, а паколькі РУП «Белпошта» ўваходзіць у Сусветны паштовы саюз, то яны будуць «падарожнічаць» па ўсім свеце.

Дарэчы, два гады таму мы падтрымалі ініцыятыву святароў храма і ўстанавілі там стылізаваную пад даўніну паштовую скрынку. Турысты, якія наведваюць гэтую беларускую святыню, могуць набыць канверт, паштоўку і непасрэдна з храма адаслаць яе ў любы пункт свету. Многія наведвальнікі Каложы ўжо скарысталіся такой магчымасцю.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ І ПАШТОВЫЯ МАРКІ

Валянціна ПУХ, дырэктар Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта», сказала, што адным з галоўных набыткаў гэтага года стала адкрыццё чатырох новых аддзяленняў паштовай сувязі: у Кобрыне, Бярозе, Іванаве і Баранавічах.

— Сёмае аддзяленне адкрыта ў новым мікрараёне Кобрына, — гаворыць Валянціна Мікалаеўна. — І, як заўважыў на яго адкрыцці старшыня Кобрынскага гарвыканкама Аляксандр Зазуля, новая пошта адразу ж стала запатрабаваным сацыяльным аб'ектам. У сакавіку мы адсвяткавалі таксама адкрыццё аддзялення паштовай сувязі ў Бярозе. Менавіта адсвяткавалі, бо новыя аб'екты сведчаць аб тым, што паштовая галіна можа працаваць эфектыўна, адшукваючы магчымасці для свайго развіцця, для пашырэння спектра паслуг і павышэння якасці абслугоўвання.

Адкрыццё яшчэ аднаго паштовага аб'екта ў Іванаве атрымалася асабліва ўрачыстым, бо фактычна супала са святам абласных «Дажынак». У горад, які значна абнавіўся і памаладзеў да фестывалю, аддзяленне пад нумарам 1 упісалася даволі арганічна. І не толькі вонкавы выгляд будынка адпавядае сучасным патрабаванням, новая пошта абсталявана па апошнім слове тэхнікі. Кліенты маюць магчымасць адпраўляць паскораную пошту EMS, «Камфорт», «1 клас», а таксама атрымліваць грашовыя пераводы, пенсіі і дапамогі, ажыццяўляць самыя розныя плацяжы. Новы пункт паштовай сувязі з'явіўся не так даўно і ў Баранавічах.

— Брэст пражыў год у статусе культурнай сталіцы Беларусі, — працягвае Валянціна Пух. — На гэту падзею «Белпошта» адгукнулася выпускам канверта з арыгінальнай маркай «Брэст — культурная сталіца Беларусі 2015» накладам 40 тысяч экзэмпляраў. Першае спецыяльнае гашэнне канверта мы правялі 1 жніўня падчас святкавання Дня горада. Тады ж прайшла філатэлістычная выстава, прысвечаная культурнай сталіцы краіны.

Дваццаты, юбілейны фестываль тэатральнага мастацтва «Белая вежа» мы таксама адзначылі выпускам паштовай прадукцыі. Марка з серыі «Тэатры Беларусі» выйшла з надпісам «Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы». На марцы адлюстравана сцэна са спектакля «Прымакі», пастаўленага брэсцкім тэатрам. Гашэнне адбылося на цырымоніі адкрыцця міжнароднага фестывалю.

У верасні споўнілася 150 гадоў дня заснавання Свята-Сімяонаўскага кафедральнага сабора ў Брэсце. Прыемна, што да падзеі духоўнага жыцця спрычынілася і пошта. Картка з маркай, прысвечанай названаму сабору, выйшла ў абарачэнне менавіта да юбілею, які шырока адзначалі ў горадзе над Бугам. І зусім нядаўна наша ведамства прэзентавала паштоўку з нагоды 350-годдзя манетнага двара ў Брэсце. Так што ў гэтым годзе мы ўвесь час знаходзіліся ў гушчы падзей свайго рэгіёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ДЗВЕ КАРЭІ

Ці магчыма стварэнне адзінай дзяржавы?

Паўночная і Паўднёвая Карэі рэгулярна ў «топе» паведамленняў стужак навін сусветных інфармагенцтваў. Не стаў выключэннем і сёлетні снежань. Прычым падстаў пагаварыць пра дзве краіны-суседкі на адным паўвостраве насамрэч было багата. Напрыклад, на мінулым тыдні ў КНДР узгадвалі жалобную дату — у снежні 2011-га пайшоў з жыцця Кім Чэн Ір, які кіраваў краінай 17 гадоў. Тысячы людзей прыйшлі да яго помніка ў Пхеньяне. Таксама ў снежні дзве Карэі правялі двухдзённыя перамовы ў сумеснай індустрыяльнай зоне Кэсон. КНДР прадстаўляў намеснік адказнага сакратара Камітэта па мірным аб'яднанні радзімы Чон Чжон Су, а паўднёвакарэйскую дэлегацыю ўзначальваў намеснік міністра па справах нацыянальнага аб'яднання Хван Бу Гі. Праўда, перамовы аказаліся безвыніковымі — пагаднення па іх выніках дасягнута не было. Як заўважаюць эксперты, перспектывы стварэння адзінай дзяржавы на Карэйскім паўвостраве дасюль застаюцца няпэўнымі.

ПА 38-ай ПАРАЛЕЛІ

Міфалогія пачынае адлік карэйскай гісторыі дакладна — з 2333 года да нашай эры. Паводле легенды, менавіта тады Тангун, сын жыхара неба і мядзведзіцы, якая ператварылася ў жанчыну, заснаваў першую дзяржаву Часон, названую пасля Старажытным Часонам. Цікава, што афіцыйная карэйская гістарыяграфія таксама вядзе адлік палітычнай гісторыі ад гэтага часу, хоць пытанні пра этнакультурную прыналежнасць гэтай дзяржавы, час фарміравання яе дзяржаўнасці і нават месцазнаходжанне (па адной з тэорый — па-за межамі паўвострава) дасюль выклікаюць спрэчкі.

У першай палове першага тысячагоддзя нашай эры ў Карэі склаліся тры дзяржавы — Сіла, Пэкчэ і Кагуро. У другой палове VII стагоддзя Сіла ў саюзе з кітайскай дынастыяй Тан разграміла Пэкчэ і Кагуро, а потым пасля вайны з Тан аб'яднала пад сваім кантролем большую частку Карэйскага паўвострава — тэрыторыю на поўдзень ад ракі Тэданган. Так узнікла дзяржава Аб'яднанае Сіла.

Афіцыйная карэйская гістарыяграфія згадвае і пра дзяржаву Пархэ, якая існавала ў 698—926 гг. і займала частку тэрыторыі Карэйскага паўвострава, а таксама сучаснага расійскага Прымор'я і Маньчжурыі. Напрыканцы X стагоддзя пасля распаду Аб'яднанага Сілы ўтварылася дзяржава Каро, межы якой практычна супадалі з тэрыторыяй цяперашняй Карэі. У 1392 годзе на змену Каро прыйшла дзяржава Часон. У XVI—XIX стагоддзях тут праводзілася палітыка самаізаляцыі. Вядома, што ў 1897 годзе краіна атрымала назву Тэхан Чагук (даслоўна «Велікаханская імперыя), а ў свеце распаўсюдзілася яе азначэнне як Карэйская імперыя.

Пасля руска-японскай вайны 1904-1905 гг. Японія ўстанавіла над краінай пратэктарат, а з 1910-га анексавала яе. Незалежнасць Карэя атрымала толькі пасля Другой сусветнай вайны. У 1945-м паўночная частка Карэі апынулася ў зоне ваеннай адказнасці СССР, а паўднёвая — ЗША. Менавіта да гэтага часу адносіцца размежаванне па 38-й паралелі паўночнай шыраты. У 1948 годзе былі створаны дзве дзяржавы — Рэспубліка Карэя і КНДР.

У 1950-м паміж краінамі пачалася вайна, якая завяршылася ў ліпені 1953-га падпісаннем у мястэчку Пханмунджом пагаднення пра перамір'е і стварэнне дэмілітарызаванай зоны. Паласа зямлі шырынёй у 4 км і даўжынёй у 250 км дасюль праходзіць паміж Паўночнай і Паўднёвай Карэяй, падзяляючы Карэйскі паўвостраў па 38-й паралелі прыблізна пасярэдзіне. Шмат гадоў дэмаркацыйную лінію на Карэйскім паўвостраве называлі адным з галоўных франтоў «халоднай вайны». Таксама вызначана і заходняя марская мяжа. Яна праходзіць па Паўночнай размежавальнай лініі ў Жоўтым моры. Мірнага дагавора, які фармальна завяршыў бы вайну, падчас якой загінулі тры мільёны чалавек, падпісана так і не было.

«РАЗУМНЫЯ» ЗАВОДЫ

Такім чынам, дзве краіны на адным паўвостраве, якія пасля Другой сусветнай вайны апынуліся на аднолькавых стартавых пазіцыях. І што цяпер? Спачатку пойдзем на поўдзень ад 38-й паралелі, дзе знаходзіцца Рэспубліка Карэя (арыгінальная назва Хангук ці Тэхан). Гэтая краіна даўно прыцягвае ўвагу ўсяго свету. Эканоміка Паўднёвай Карэі з'яўляецца 13-й у свеце па валавым унутраным прадукце (па парытэце пакупніцкай здольнасці — ППЗ) і 15-й па намінальным ВУП. Валавы ўнутраны прадукт па ППЗ на душу насельніцтва вырас са 100 долараў у 1963 годзе да больш як $35 тыс. летась.

Ключавыя кірункі развіцця за шасцідзесяцігадовую гісторыю існавання дзяржавы моцна змяніліся. У 1940-х эканоміка краіны абапіралася пераважна на сельскую гаспадарку. Цягам наступных некалькіх дзесяцігоддзяў акцэнт рабіўся на лёгкую прамысловасць і вытворчасць тавараў народнага спажывання, а ў 70-х і 80-х гадах XX стагоддзя — цяжкую прамысловасць.

Паводле звестак Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, сярэдні паўднёвакарэец адпрацоўвае ў год 2193 гадзіны. Для параўнання: у Германіі гэты паказчык складае 1409 гадзін.

Цягам 30 гадоў пасля таго, як прэзідэнт краіны Пак Чон Хі ў 1962-м абвясціў пачатак першай пяцігодкі, эканоміка краіны расла вельмі высокімі тэмпамі, ды і сама структура моцна змянілася. За проста ашалямляльныя паказчыкі ў 1960-1990-я гады Рэспубліку Карэя, разам з Сінгапурам, Ганконгам і Тайванем, аналітыкі трапна назвалі «азіяцкімі тыграмі».

Праўда, імклівы рост ВУП у 1980-х адчувальна замарудзіўся — да 6,5% у год, — але, пагадзіцеся, гэта таксама нямала. Як і ў іншых высокаразвітых краінах, да пачатку 1990-х гадоў сфера паслуг стала дамінантнай у эканоміцы краіны; цяпер на яе долю прыпадае дзве траціны аб'ёму валавога ўнутранага прадукту краіны.

Акрамя ўсяго іншага, Рэспубліка Карэя — найбуйнейшы ў свеце суднавытворца (45-працэнтная доля рынку). Актыўна рухаецца краіна і ў касмічнай сферы. Пачынаючы з 1992 года, адправіла ў космас да 10 спадарожнікаў, праўда, усё з выкарыстаннем замежных ракет-носьбітаў і на замежных касмадромах. Напрыклад, у партнёрстве з Расіяй паляцелі Arirang-1 у 1999 годзе і Arirang-2 у 2006-м. У красавіку 2008 года Лі Со Ён стала першай карэйскай жанчынай-касманаўтам, якая паляцела ў космас на борце расійскага «Саюз ТМА-12»

У чэрвені 2009 года ў павеце Кахын правінцыі Чола-Намбда было завершана будаўніцтва першага ў Паўднёвай Карэі касмадрома Нара. Першы запуск «Нара-1», у жніўні 2009 года, завяршыўся правалам. Другая спроба ў чэрвені 2010-га таксама была няўдалай. Аднак трэці запуск «Нара-1» у студзені 2013 года прайшоў паспяхова. Урад плануе распрацаваць ракету «Нара-2» да 2018-га.

Яшчэ адзін цікавы кірунак — робататэхніка. З 2003 года яна была ўключана ў спіс асноўных нацыянальных праектаў. У 2005-м карэйскі вядучы навукова-тэхнічны інстытут распрацаваў чалавекападобнага робата HUBO. У маі 2006 года каманда Korea Institute of Industrial Technology распрацавала першага карэйскага робата-андроіда EveR-1. У лютым 2010 года, у сувязі з недахопам настаўнікаў, стала вядома пра планы стварэння робатаў, якія будуць выкладаць англійскую мову. Ужо ў 2013 годзе ў дашкольных установах сталі з'яўляцца найбольш паспяховыя распрацоўкі.

Адна з апошніх навін тычыцца стварэння «разумных» заводаў, у сістэме вытворчасці і кіравання якіх будуць ужывацца інфармацыйныя тэхналогіі. У гэтым вазьмуць удзел 18 інавацыйных цэнтраў крэатыўнай эканомікі, размешчаных па ўсёй Паўднёвай Карэі. Цягам двух наступных гадоў цэнтры засяродзяць намаганні на мадэрнізацыі заводаў больш як 600 малых і сярэдніх кампаній. Для гэтага ім выдзеляць 25,8 мільёна долараў і накіруюць 150 спецыялістаў ад Samsung Electronics. Пад «разумнымі» заводамі маюцца на ўвазе цалкам аўтаматызаваныя вытворчыя пляцоўкі. Да 2020 года колькасць такіх прадпрыемстваў плануецца давесці да 10 тысяч.

Працавітасць, дысцыпліна плюс генетычная схільнасць да дакладных навук з'явіліся залогам таго поспеху, якога карэйцы дасягнулі ў параўнальна кароткія тэрміны, ператварыўшыся ў адну з найбольш развітых і высокатэхналагічных краін свету. Дарэчы, максімальны працоўны водпуск у гэтай краіне не перавышае і тыдня. Паводле звестак Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, сярэдні паўднёвакарэец адпрацоўвае ў год 2193 гадзіны. Для параўнання: у Германіі гэты паказчык складае 1409 гадзін.

МАДЭЛЬ ДЛЯ ЧАСОНА

Цяпер на поўнач — у Карэйскую Народную Дэмакратычную Рэспубліку (арыгінальная назва Часон). Традыцыйнае ўяўленне пра КНДР як пра запаведнік сталінізму састарэла даўно і безнадзейна, хоць яго па-ранейшаму актыўна тыражуюць сусветныя СМІ. Насамрэч асцярожныя эканамічныя рэформы ідуць у Паўночнай Карэі ўжо не першы год. Напачатку 1990-х дзяржаўная прамысловасць КНДР, якая раптоўна засталася без савецкіх субсідый, развалілася. Значная частка прадпрыемстваў спыніла працу, аб'ём вытворчасці зменшыўся ўдвая. Крытычны недахоп угнаенняў і калапс ірыгацыйных сістэм з-за адсутнасці электрычнасці прывялі да таго, што сельская гаспадарка, і без таго не вельмі неэфектыўная, абвалілася. У выніку настаў голад 1996—1999 гадоў.

Аднак ва ўмовах эканамічнай катастрофы ўзняўся і пачаў хутка развівацца прыватны сектар эканомікі Паўночнай Карэі. Людзі знаходзілі розныя спосабы зарабляць сабе на жыццё. Сяляне нелегальна разворвалі палеткі на горных схілах. Усе, хто толькі мог, кінуліся гандляваць, а тыя, каму гандляваць не было чым ці на што, у пошуках працы рушылі ў Кітай праз мяжу, якая дрэнна ахоўвалася. У 2000-х у краіне з'явіліся прыватныя рэстараны, прыватныя транспартныя прадпрыемствы і нават шахты і заводы (фармальна яны зарэгістраваны як дзяржаўныя). Менавіта рост прыватнай эканомікі разам са стыхійнымі зменамі ў эканоміцы дзяржаўнай і ўдалымі крокамі паўночнакарэйскіх дыпламатаў прывялі да таго, што краіна паступова выйшла з крызісу.

Няхай і запознена, і вельмі нясмела, але Паўночная Карэя ступіла на шлях рыначных рэформаў, выбіраючы мадэль, што бліскуча спрацавала ў Кітаі і В'етнаме. Рэформы ў Паўночнай Карэі пачаліся, як і можна было меркаваць, з сельскай гаспадаркі, якую ў 2013 годзе перавялі на сямейны падрад. Раней сяляне працавалі за фіксаваныя пайкі, а цяпер — за 30 працэнтаў ураджаю. Вынікам сталі рэкордныя ўраджаі 2013-га і 2014 гадоў, дзякуючы якім КНДР упершыню за чвэрць стагоддзя наблізілася да ўзроўню самазабеспячэння харчаваннем.

Адначасова былі прыняты захады па прыцягненні замежнага капіталу. У дадатак да трох спецыяльных эканамічных зон (СЭЗ), што існавалі дагэтуль, заснавалі яшчэ дваццаць. СЭЗ павінны стаць тэрыторыяй, на якой могуць вольна — як, напрыклад, у В'етнаме — дзейнічаць замежныя інвестары. Аднак самы важны крок быў запланаваны на гэты год. У адпаведнасці з прынятым яшчэ ў маі 2014-га рашэннем кабінета міністраў і ЦК, сёлета на поўны гасразлік павінна была перайсці ўся прамысловасць КНДР.

У паўночнакарэйскім разуменні гасразлік азначаў бы, што дырэктары прадпрыемстваў атрымалі б права набываць па рыначных цэнах і ад выбраных імі пастаўшчыкоў сыравіну, складнікі і абсталяванне, па сваім разуменні прадаваць гатовую прадукцыю. Таксама на свой розум яны змаглі б наймаць і звальняць персанал і плаціць супрацоўнікам столькі, колькі лічаць патрэбным. Праўда, пакуль гэтага не адбылося.

Частка прадпрыемстваў усё ж працуе па новай схеме. Яны адрозніваюцца, перш за ўсё, велізарнымі для гэтай краіны зарплатамі, якія дасягаюць 300-500 тысяч паўночнакарэйскіх вон, што па рыначным курсе адпавядае 50-70 амерыканскім доларам у месяц. Тым часам як зарплата на большасці прадпрыемстваў, якія працуюць па старой мадэлі, не перавышае аднаго долара (у асноўным каля 50 цэнтаў). Тых, што перайшлі на новую схему, мала, і яны па-ранейшаму лічацца «эксперыментальнымі».

Шэраг экспертаў лічаць, што рэформу вырашылі адкласці па цалкам прагматычных меркаваннях. Увядзенне новай сістэмы заработнай платы здольнае справакаваць чарговы прыступ гіперінфляцыі, так што для арганізацыі такіх змен трэба правесці адпаведную падрыхтоўку ў крэдытна-банкаўскай сферы. Можна спадзявацца, што менавіта гэтым цяпер у Пхеньяне і займаюцца. Тым больш што рэформы не згортваюцца. Сельская гаспадарка па-ранейшаму працуе па прынцыпе сямейнага падраду. Прыватны бізнес, які ў КНДР развіты куды мацней, чым прынята думаць, таксама не сутыкаецца з праблемамі. Працягваюцца спробы прыцягнуць у краіну замежных інвестараў, хоць, трэба прызнаць, пакуль без заўважных вынікаў.

Такім чынам, рэформы, якія ішлі без значнага інфармацыйнага ажыятажу, улады Паўночнай Карэі апошнім часам прытармазілі. Ці азначае гэта поўную змену курсу ці, што больш верагодна, толькі яго карэктаванне, пакажа час. Таксама як і тое, наколькі магчыма стварэнне адзінай карэйскай дзяржавы, бо ў свеце, пэўна, няма настолькі розных памежных краін. Адно можна адзначыць дакладна: апошнім часам рух у гэтым кірунку заўважна актывізаваўся.

Захар БУРАК.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	Производственное унитарное предприятие «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», г. Минск, проспект Партизанский, д. 168

Предмет аукциона

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь	Назначение	Адрес
Магазин	500/С-19459	218,2 кв.м	Здание специализированное розничной торговли	г. Минск, ул. Щедрина, 75А

Сведения о земельном участке *(предмет аукциона находится в красных линиях)*:	Предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания здания специализированного розничной торговли на праве аренды земельный участок площадью **0,0879** га (срок действия – по 30.09.2018). Ограничения (обременения) прав: охранная зона водопровода площадью 0.0196 га, обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям-владельцам инженерных коммуникаций площадью 0,0879 га
Начальная цена с НДС 20% – 2 735 731 200 белорусских рублей (снижена на 20%)	
Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.10.2015 г.

Дата и время проведения аукциона	29.01.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Дата и время окончания приема документов	27.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Контактные телефоны	Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	ОДО «СПАРТАК ПЛЮС», г. Минск, ул. М. Лынькова, 19, корп. 2

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Торговый зал, кабинет, гардеробная, склады, моечная	Торговое помещение	151 кв.м	500/D-708166944	г. Минск, ул. Михася Лынькова, 19/ 2-13а

Начальная цена с НДС 20% – 1 830 000 000 белорусских рублей.	
Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Дата и время проведения аукциона	22.01.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Дата и время окончания приема документов	21.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Контактные телефоны	Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by

ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ТРЭБА ДАКАЗАЦЬ!

У Беларусі плануецца ўзмацніць адказнасць за рэкламу лекавых сродкаў і метадаў аказання медыцынскай дапамогі без узгаднення з Міністэрствам аховы здароўя.

У Мінгандлю паведамілі, што цяпер праводзіцца работа па ўнясенні адпаведных змен у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях. Таксама мяркуецца ўзмацніць адказнасць за вытворчасць і распаўсюджванне рэкламы пра лячэбныя ўласцівасці тавару, калі такімі ўласцівасцямі ён не валодае. За здзяйсненне такіх правапарушэнняў мяркуецца прадугледзець штрафныя санкцыі для юрыдычных асоб ад 40 да 200 базавых велічынь. Для індывідуальных прадпрымальнікаў — ад 30 да 100 базавых велічынь, для іншых фізічных асоб — ад 10 да 50 базавых велічынь. Сёння адказнасць за агульныя парушэнні заканадаўства аб рэкламе складае для юрыдычных асоб ад 20 да 50 базавых велічынь, для ІП — ад 10 да 40 базавых велічынь, для іншых фізічных асоб — 5 ад 30 да базавых велічынь.

У Міністэрстве гандлю нагадалі, што ў краіне даўно дзейнічае забарона на рэкламу рэцэптурных лекавых сродкаў. Але пасля таго, як быў уведзены жорсткі кантроль за рэцэптурным водпускам лекаў у аптэках, гэтыя прэпараты пачалі прапаноўваць набыць праз інтэрнэт. Пра якую бяспеку можа ісці размова, калі чалавек набывае лекі з рук, незразумела... Магчыма, павелічэнне штрафных санкцый папярэдзіць падобныя факты?

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Простая мова

ЧАЛАВЕК МЯРКУЕ...

Як той акын — пішу, што бачу, а значыць...
Раніца. Спешка. Дарога — на машыне, праз лес і поле, праз сонныя змрочныя вёскі, бо ўзімку ў рэдкіх вокнах блішчыць святло...
Якраз на яго (перад чарговай павароткай) мы кіруемся; якраз у ім, у гэтым святле (акно без фіранак), пад'ехаўшы, бачым постаць мужчыны: з аб'ёмнага, мусіць, вельмі старога чайніка, у свой кубак ён паволі налівае вар...
І тым самым ці не ўсім, хто праходзіць (калі, вядома ж, праходзіць) альбо, як мы, «пралятае» міма, нагадвае крылатае «ўсюды людзі, усюды жыццё».
Розніца хіба ў доме, у кухні, у чайніку і чалавеку...
А так... Раніца яна і ёсць раніца.

СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

Крамка ў двары, у так званай крокавай даступнасці — з хлебам, малаком, тварагом...

У метры ад дзвярэй — вялікая абвестка ці нават зварот, напісаны, відавочна, дзіцем, але ж «па-даросламу» — з камп'ютарам, з прынтарам... Змест (у блізкім пераказе): пасля смерці адной жанчыны нічыйнай засталася котка (фота дадаецца, як той казаў). Яна вельмі акуратная і разумная, таму нават зараз, на вуліцы, напэўна ж, не прападзе, выжыве, «але побач (даслоўна) столькі дрэнных людзей...» То ці не знойдзецца нехта добры, хто возьме гэту прыгажуню дамоў?

Цікавая прапанова!

А вось попыту — з тыдзень не было. Цягам яго, таго тыдня, назіралася іншае: ля крамкі, пад абвесткай, стаяла невялічкая скрынка з падсцілкай (трэба разумець, часовы кошчын дом?), побач — дзве місачкі: у адной пастаянна была дробна парэзаная каўбаска, у другой — малако...

Як сведчанне таго, што добрых людзей у нас таксама шмат.

ЭКАНОМІЯ

У горадзе ад крам да транспартных прыпынкаў, як правіла, блізка — што называецца, рукою падаць.

Але ж (перафразуючы) «дармо, што «падаць», ды далёка дыбаць», а ўжо з нейкай пакупкай...

Перад намі адна кабета драбіны нясе. Яны — дзюралевыя і, дакладна ведаем, зусім не цяжкія, але ж досыць доўгія, у плыні людзей... Да таго ж вечар на дварэ ды і сама кабета, мякка кажучы, вельмі сталага веку, хваравіта поўная... Грэх не падмагчы.

— Ой, дзякуй!.. Шчыры дзякуй вам! — радуецца тая, выціраючы ўзмакрэлы твар.

І тут жа пачынае расказваць, што гэтыя драбіны ім на дачы вельмі патрэбны, што купіць іх збіраліся даўно, ды ўсё грошай не было, таму на вясну адлажылі. А сёння яна ў краму зайшла, а там раптам зніжкі — ажно 10 працэнтаў.

— Ну ці ж не эканомія? — немаведама ў каго пытае жанчына. — Нельга ж было не купіць?

...Нельга.

Але ж нельга, напэўна, і не думаць, як потым дацягнуць пакупку, не страціўшы пры гэтым апошняе здароўе, а то, крый Бог, і жыццё.

НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА

...З гэтага высокага берага ўніз, у ваду, Стас сігаў мільёны разоў — у дзяцінстве, у юнацтве...

А вось потым перапынак быў, прычым досыць доўгі: пакуль служыў у войску, пакуль жаніўся ды абжываўся на новым месцы...

Страшэнна сумаваў па старым — па бацькоўскай хаце, па вёсцы, па рэчцы, спаў і бачыў, як летам прыедзе, як, павітаўшыся з бацькамі, пойдзе на бераг, як на хаду раздзенецца і...

Мары здзяйсняюцца! Сёлета ён так і зрабіў: сігануў — салдацікам, можна сказаць, не гледзячы...

Назад — сам не выплыў: гэта шчасце, што побач купаліся дзеці... Што яны цяпер змыслыя, пры мабільніках, што адразу ж пазванілі ў «хуткую», што тая і насамрэч хутка завезла яго ў бальніцу — з множнымі пераломамі левай ступні і «адзіночным» правай.

Карацей, ачуўся ў гіпсе, з паўгода ўжо на бальнічным.

...Надоечы на мыліцах першы раз на вуліцу выпаўз, у машыну сеў — з'ездзіў у гараж на колы паглядзець. Суседзі там, вядома ж, у роспыты: што зрабілася? Ён — анекдот у адказ:

— Доктар, я ў трох месцах нагу зламаў.

— А месцы тыя запомніў?

— А як жа!

— То больш туды не хадзі.

Стас не пойдзе. А нехта іншы — лёгка.

ХАЦЕЛА ЯК ЛЕПЕЙ...

«Мне з аднагодкамі зусім нецікава», — фыркала некалі Зоечка, і кавалераў шукала сярод тых, каму за 30, за 40.

Яны, як правіла, былі жанатыя, але пры машынах, грашах. Маглі звадзіць дзяўчыну ў рэстаран альбо на канцэрт заезджых «зорак», маглі звазіць на прыроду, на шашлыкі, нешта прыгожае купіць, зняць, нарэшце, кватэру...

Дык чаму б не пажыць — на здымных, нічога не плацячы, да таго ж у спатканнях, кветках, шампанскім?..

Пра тое, што ў яе залётнікаў недзе сем'і, дзеўка не думала — навошта, калі сёння яны ёсць, а заўтра... няма? Зоя верыла ў сілу сваёй прыгажосці.

І, трэба сказаць, нездарма: адзін з кавалераў усё ж такі развёўся з жонкай, сышоўся з ёй. Праўда, папярэдзіў, што жаніцца не будзе, дзяцей заводзіць — і пагатоў...

Зоечка з гэтага шчыра пасмяялася, бо зноў жа ведала, што начная зязюлька дзённую перакукуе, і ўрэшце ўсё будзе, як будзе, а гэта значыць, як скажа яна.

Па дробязі яно так і выйшла, а вось па вялікім рахунку...

Дванаццаць гадоў жывуць, калі гэта, вядома ж, жыццё: бо афіцыйна яны не жанатыя, дзяцей няма, сабачацца зранку да вечара і ледзь не штодня,

Ёсць з-за чаго: ён разбурыў сваю сям'ю.

Яна — не стварыла сваёй.

КАБ НЕ БЛУДЗІЛІ...

Дзень, горад, голас:

— *Здравствуйте!.. Скажите, пожалуйста, как нам пройти к «Беларусі»?*

Пытаюцца пра гэта двое досыць сімпатычных прыезджых (калі меркаваць па іх чысцюткай рускай...). То чаму б не сказаць, што ўнівермаг гэты зусім непадалёк, што прайсці да яго можна па вуліцы Пляханава, а потым збочыць управа, альбо...

Мужчыны, відаць, спяшаюцца, бо, не даслухаўшы, перапыняюць; перапыняюць цалкам лагічным, але ж зусім нечаканым пытаннем:

— А кудой бліжэй?

...Хоць ты падвядзі іх, з удзячнасці за гэтае рэдкае, беларускае слоўца!

Каб дайшлі, каб хаця не збludзілі, не страцілі час.

ПАСЛЯСМАЧА

Дзень. Абед. Кавярня — прыватная і, здаецца, любімая, бо, маючы вольную хвіліну тут, за кубачкам кавы, можна пасядзець з добрым чалавекам, і ніхто пры гэтым не стане выціраць ваш стол, намякаючы, што трэба сыходзіць...

А можна прыйсці сюды аднаму — на пяць хвілін, са сваім бутэрбродам і...

Варта было дастаць яго, як побач за стол прысела жанчына. Уважліва паглядзела на ўзяты кубачак кавы, на булачку, на кашалёк, які палажыла побач.

— А я вам заплаціла? — павярнуўшыся да стойкі, спытала раптам у гаспадара (ён жа сёння барыста).

— Не, — усміхнуўся той.

— А чаму ж вы нічога не кажаце?

— Не хачу вам смак псаваць.

— А калі я булачку з'ем, кавай зап'ю і пайду, не разлічыўшыся? — уголас разважае кабета, кіруючы з грашыма да стойкі.

— Але ж вы не сыходзіце? — усміхаецца ёй гаспадар. — А калі і так, дык, можа ж, я не збяднею?..

Не збяднее, відаць, сапраўды...

Бо, здаецца, ведае, як «прыкарміць» кліента і што рабіць, каб той, хто зайшоў адзін раз, прыходзіў заўсёды.

НАПІСАНАМУ ВЕРЫЦЬ?

Прагрэс не стаіць на месцы. У Мінску на многіх прыпынках з'явіліся адмысловыя экранчыкі: паглядзеў на такі і ўбачыў, што, напрыклад, патрэбны 41 тралейбус будзе...

Во ліха — праз 15 хвілін!..

Марнаваць іх, тым болей зранку, зусім не выпадае, а таму — лахі пад пахі, як той казаў, і на трамвай.

Поруч, туды ж, але з цяжкімі сумкамі, прастуе нейкі дзяцюк.

Разам з ім мы даходзім да скрыжавання, стаім на святлафоры. Але дарогу перайсці не паспяваем, бо насустрач нам паўзе... 41-шы тралейбус — той самы, трэба разумець, што павінен быў прыйсці праз 15 хвілін!

Сказаць, што дзяцюк абураны, значыць прамаўчаць: сплюнуўшы, ён гне мацюка і немаведама ў каго пытаецца:

— *Што* яны пішуць? Ну *што* яны пішуць, га?

...Балючае пытанне — з тых, што не забудзеш, не выкінеш з галавы ніколі, бо... не дадуць. Перш-наперш — сіноптыкі....

Ды і шмат хто яшчэ.

ТУТЭЙШЫЯ

Град забіты — бязліч машын: па вуліцах часам едзеш, як ідзеш, з той самай хуткасцю.

А часам — стаіш наогул, чытаеш... надпісы.

На заднім шкле адной з машын дарэчнае ў заторах: «Спяшаешся — пераскоч!». На другой — фрагмент нацыянальнага арнаменту і кароткая пазнака: «З намі — маленькі».

Трэба разумець, беларус?

ПАРАЎНАННЕ

Галю хлебам не кармі — дай пасправацца. Ды хоць пра што: яна да любога слова прычэпіцца, і ўжо тады сцеражыся: трэба не трэба, а дакажа вам, што пазамінулае лета было халодным, а восень — грыбною, што харчовыя дабаўкі карысныя (альбо наадварот), што мода на малінавыя пінжакі не прайшла, а прыйшла...

Аднак гэта — кветачкі. Надоечы кампаніі гасцей (усім каля 60) яна ўзялася даводзіць, што ў іх узросце (?!) грошай ужо не трэба (?!), што пенсій на ўсё ім павінна хапаць, прычым з галавой... Калі, вядома ж, з мазгамі (?!) траціць...

Спрэчка разгарэлася не на жарт!

Цётка адна «патушыла»: як бы мімаходзь сказала пляменніцы, што з пенсіяй цяпер, як з «крытычнымі днямі»: месяц чакаеш, дзён колькі маеш і ўсё — чакай ізноў...

Што здзівіла, Галя ёй не пярэчыла.

ТАНЦУЙ, ПАКУЛЬ МАЛАДЫ

Ранак, вечар... Новы год. Крамы — у чаканні — прыбраліся.

У адной, пад ялінай, танчыць Дзед Мароз. І калі б жывы, хто б з дарослых здзіўляўся? А то ж у рост чалавека і... цацачны: музыку слухае, «пятай кропкай» віхляе... Люба паглядзець, люба побач пачуць ціхуткае:

— Баб, а чаму Дзед Мароз танцуе, а Снягурка — не?

— Хто ж яго ведае? — уздыхае бабуля.

А потым, відаць, падумаўшы, дадае:

— Можа, таму, што Снягурка маладая — лічыць, што яшчэ натанцуецца... А Дзед — стары. Вось і «адрываецца». Думае: можа, дацягну да новых Каляд, а можа, і не...

Чалавек мяркуе...

Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

P.S. *Не верыцца: «Простай мове» 16-ты год. Наколькі ведаю, у яе за гэты час, з'явілася сваё, і не маленькае, кола чытачоў. З асобнымі лёс зводзіў, з многімі, спадзяюся, яшчэ звядзе...*

А пакуль — будзем жыць, разам берагчы сваю мову, нешта прыкмячаць, над нечым смяяцца і плакаць, думаць.

Дзеля чаго, уласна, пішу... І, дасць Бог, буду.

■

■ Чытаем разам

ХТО ТАКІ БАЛОТНІК?

Адказ падкажа казка

«Я!» — «Я!» — «Я!» — «Калі ласка, можна я? Калі ласка!» Вочы, поўныя «запалу і агню». Дзясяткі рук, што імкліва ўскінуліся ўверх. І гэта не ўрок у канцы чвэрці, калі дзецям выпадае апошні шанц выправіць дрэнныя адзнакі. Гэта — кніжны марафон «Калядная казка», арганізаваны Выдавецкім домам «Звязда» сумесна з сеткай крамаў «Белкніга» ў рамках рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне». А прайшоў ён 15 снежня ў Доме кнігі «Светач» у Мінску.

Дзеці, якія завіталі ў госці да «Калядной казкі», сталі непасрэднымі ўдзельнікамі падарожжа ў свет фантазій і незвычайных прыгод. А сімвалам таго, што мерапрыемства пачалося, стаў узмах чароўнай палачкі ў руках вядучай! Чаму менавіта «марафон»? Таму што адразу некалькі беларускіх аўтараў, якія пішуць для дзяцей, познаёмілі гасцей сустрэчы са сваімі казкамі, вершамі і загадкамі. Анатоль Зэкаў, Галіна Пшонік, Віктар Кажура, Яна Явіч — пісьменнікі імкнуліся не проста расказаць пра свае творы, але даць дзецям магчымасць стаць актыўнымі ўдзельнікамі казачнай дзеі. У гэтым ім дапамаглі гульні, інтэлектуальныя заданні і спецыяльныя «казачныя» пытанні. Колькі боцікаў патрэбна вожыку, каб абараніць ад холаду сваіх дзетак? Хто такі Балотнік, і як да яго змагла трапіць звычайная дзяўчынка Зося? У якіх ягад лісточкі «быццам вушкі», а на «тварыках» — вяснушкі? Напэўна, дарослым няпроста адказаць на гэтыя пытанні. А вось дзеці справіліся з заданнем «на ўра»! За што і атрымалі прыемныя падарункі ад арганізатараў.

Удзельнікі кніжнага марафона пісьменнікі Галіна ПШОНІК і Анатоль ЗЭКАЎ.

І хоць асноўная мэта кніжнага марафона — абудзіць у дзецях інтарэс да сучасных беларускіх аўтараў, паказаць, што ў іх ёсць шмат цікавых твораў для юных чытачоў (і яна была дасягнута!), важна нават не гэта. У пісьменнікаў атрымалася стварыць душэўную і шчырую атмасферу свята, якой часта так не хапае ў паўсядзённым жыцці. І кожны з прысутных імкнуўся далучыцца да гэтай светлай і добрай Казкі.

Дарэчы, у рамках рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне», адным з заснавальнікаў якой з'яўляецца Выдавецкі дом «Звязда», пісьменнікі актыўна праводзяць прэзентацыі сваіх кніг не толькі ў кніжных крамах, але і ў бібліятэках і школах. «На мой погляд, «Сямейнае чытанне» — гэта вельмі добрая культуралагічная акцыя з вялікім выхаваўчым патэнцыялам, — кажа Галіна Пшонік, пісьменніца і журналіст, якая прыняла ўдзел у кніжным марафоне. — Я бачу, што дзецям сёння не хапае інтэлектуальных зносінаў. Такіх, якія можа забяспечыць сустрэча з цікавымі людзьмі. З нашымі сённяшнімі аўтарамі, напрыклад. Калі ж адбываецца такі сінтэз інтэлектуальнага і духоўнага, ды яшчэ пры непасрэдным удзеле беларускіх аўтараў, — гэта вельмі важна для выхавання свядомай асобы».

Дзеці заўсёды вераць у казку.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Як пісаць дзіцячыя кнігі, каб зацікавіць юных чытачоў? З такім пытаннем мы звярнуліся да Алены МАЛЬЧЭЎСКАЙ, якая гэтымі днямі прэзентавала сваю кнігу «Ша-ша з левага чаравіка» ў адной з крамаў РУП «Белсаюздрук»:

— Ведаеце, нейкага выпрацаванага падыходу ў мяне няма. Але ёсць жа такая вядомая фраза, што пісаць для дзяцей трэба гэтак жа, як для дарослых, толькі лепш. Мне падаецца, што трэба пісаць як для сябе і пра сябе — але ў пэўным дзіцячым узросце. Калі я прыдумляла казачныя гісторыі, узгадвала менавіта сябе — у 11 год. Будзьце шчырымі — і ваш твор прыцягне ўвагу чытачоў.

Алена ЗАРЭЧНАЯ.

■ Дзень падпісчыка

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ

На дні падпісчыка ў Столінскім паштовым аддзяленні №1 гаспадынямі былі супрацоўніцы Марына Кошман і Таццяна Папейка. Яны шчыравалі каля загадзя падрыхтаваных стэндаў і ветліва запрашалі кожнага кліента пошты не абмінуць падпісны столік.

Сюды ж зазірнулі намеснік начальніка раённага вузла паштовай сувязі Вера Паўлаўна Панкевіч ды інструктар па падпісцы Вера Міхайлаўна Каляда. Апошняя многіх чытачоў нашай газеты ведае па імёнах і прозвішчах, бо яны чытаюць газету дзесяцігоддзямі. Як, напрыклад, вядомы на Століншчыне юрыст, які доўгі час узначальваў раённы суд — Фёдар Уладзіміравіч Стахавец. Вера Міхайлаўна гаворыць, што пастаянныя падпісчыкі часцей афармляюць квітанцыі ў паштальёнаў, гэта зручна: калі і забудзешся, паштальён падкажа.

Прыемна, што сярод нашых уважлівых і ўдумлівых чытачоў аказаўся старшыня раённага Савета дэпутатаў Аляксей Дзямко. Аляксей Аляксеевіч адзначыў, што дадатак «Мясцовае самакіраванне» ён складвае ў асобную папку, на некаторыя матэрыялы звяртае ўвагу старшынь сельскіх Саветаў. Кіраўнік раённай прадстаўнічай улады падзякаваў за тое, што газета дае магчымасць работнікам Саветаў пазнаёміцца з вопытам калег з іншых абласцей і раёнаў.

Першы чалавек, з якім сустрэлася аўтар гэтых радкоў у Жабінцы, аказаўся прыхільнікам нашай газеты. У прыёмнай райвыканкама Галіна Гілеціч, адзначаючы камандзіровачнае пасведчанне, заўважыла, што не часта ёй даводзіцца ставіць подпіс у дакументах, афармленых на роднай мове. Яшчэ Галіна Мікалаеўна дадала, што газету нашу чытае даўно і атрымлівае вялікае задавальненне найперш ад сустрэчы з родным словам.

А начальнік вузла паштовай сувязі Жабінкі Людміла Саўчук назвала сярод самых адданых падпісчыкаў Надзею Жалабкову і Аляксандру Махоньку.

Аляксандра Андрэеўна Махонька жыве ў вёсцы Падлессе.

— Газету выпісваю чвэрць стагоддзя дакладна, а можа і больш, — сказала яна. — Некалі паштальёнам была, разносіла ўсе газеты, усе мела магчымасць праглядаць. А выпісвала «Звязду», бо яна здавалася мне самай блізкай па духу. І на пенсіі не расстаюся з любімым выданнем, штодзень чакаю паштальёна, каб вечарам разгарнуць газету.

Надзея Уладзіміраўна Жалабкова да выхаду на заслужаны адпачынак працавала эканамістам у райсельгастэхніцы. Паводле яе прызнання, спачатку чытала, каб не забываць родную мову, а потым прызвычаілася. І ўжо гадоў дваццаць выпісвае газету.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Столін — Жабінка — Брэст.

■ Зваротная сувязь

ІНТЭЛІГЕНТНА І ПАМЯРКОЎНА...

Каля 20 чалавек чакалі на днях дэсант «Звязды» ў аддзяленні паштовай сувязі ў Беразіно, што на Міншчыне. У асноўным — нашы верныя падпісчыкі, чытачы. Сярод іх былі і тыя, хто зацікавіўся газетай нядаўна і вырашыў больш пра яе даведацца, так бы мовіць, з першых вуснаў.

Усіх зацікаўленых дапамагла сабраць разам менеджар аддзела раённай цэнтральнай бібліятэкі Тамара Круталевіч. Тамара Мікалаеўна — вельмі неабыякавы чалавек, даўняя прыхільніца нашага выдання. Яна і павяла святочны рэй:

— Да нас прыехалі прадстаўнікі шаноўнай газеты, якая свеціць ужо 98 гадоў. У кожнага з нас ёсць шанц у чарговы раз падпісацца на любімае выданне, паўдзельнічаць у розыгрышы шчаслівай квітанцыі і атрымаць дывідэнды за тое, што вы шануеце газету, сябруеце з ёй.

Тых, хто пакуль не зусім знаёмы са «Звяздой», Тамара Мікалаеўна таксама запрасіла паўдзельнічаць у конкурсах.

— Беларуская мова прызнана Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый другой па мілагучнасці пасля італьянскай. І кажуць, калі добра размаўляеш па-беларуску, то лечыш горла, — пажартавала яна.

Веданне матчынай мовы праверылі шляхам перакладу слоў з беларускай на рускую і наадварот. І многія паказалі выдатныя вынікі. Было таксама шмат конкурсаў. Вядучая літаральна засыпала аўдыторыю пытаннямі: колькі гадоў споўнілася газеце, дакладная дата яе нараджэння, чым яна ўзнагароджана, якія рубрыкі, тэматычныя выпускі, у чым адметнасць газеты?

Напрыканцы адбыўся розыгрыш падпісных квітко. Шчасліўчыкам былі ўручаны падарункі, у тым ліку з сімволікай газеты.

Фёдар Кавалёнак атрымаў кепку з лагатыпам «Звязды». Фёдар Савельевіч 43 гады адпрацаваў у аграрным сектары: аграномам, дырэктарам саўгаса, намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі, загадчыкам аграхімлабараторыі.

— Я інвалід і езджу па горадзе на трохколавым веласіпедзе. Таму мяне ведаюць у Беразіно амаль што ўсе. А цяпер я яшчэ буду раз'язджаць у абноўцы ад «Звязды». Гэта будзе найлепшая рэклама для нашай любімай газеты. Людзі ў правінцыі вельмі непасрэдныя і цікаўныя і, вядома, рэагуюць на такія кідкія рэчы. Але галоўнае для мяне не падарунак, а ўвага. Дзякуй усім, хто арганізаваў гэтае мерапрыемства, даў магчымасць сустрэцца з людзьмі, пагутарыць.

— Я разам з газетай іду па жыцці, — уступае ў размову Анатоль Плаўскі.

У пацвярджэнне ён расшпільвае пінжак і паказвае майку з надпісам «Звязда».

— Так што «Звязда» ў мяне каля самага сэрца. А калі сур'ёзна, чытаю выданне з пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя. І заўсёды з цікавасцю.

Віктар Баравуля таксама наш пастаянны чытач. Віктар Васільевіч закончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Любоў да роднай мовы, а значыць і да «Звязды», як ён прызнаўся, у яго ў крыві.

Наталля Вяргейчык лічыць газету вельмі інтэлігентнай, памяркоўнай.

Усяго ж на «Звязду» ў гэты дзень падпісаліся 14 чалавек. Усе яны пажадалі калектыву творчых поспехаў і знаходак, а таксама выказалі спадзяванні, што такія сустрэчы стануць традыцыйнымі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

ПАЗВАНІЦЬ БУДЗЕ ДАРАЖЭЙ

Павялічваюцца тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання.

Для насельніцтва месячная абаненцкая плата павялічыцца да 27 тысяч рублёў. За кожную поўную або няпоўную хвіліну злучэння грамадзянам трэба будзе заплаціць 57 рублёў (у красавіку — 51 рубель). Поўная або няпоўная хвіліна размоў па міжгародзе без дапамогі тэлефаніста абыдзецца карыстальнікам у 130 рублёў (у красавіку было 100 рублёў). Павышэнне гранічных тарыфаў закране таксама юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«НАВАГОДНІ ФЭСТ ПРЫСМАКАЎ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2016 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 14 СТУДЗЕНЯ 2016 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А.

КУХОННЫ КАМБАЙН BOSCH MUM54240

Сярод падпісчыкаў 15.01.2016 года будзе разыграна 7 мультываракоў OURSSON і суперпрыз — кухонны камбайн Bosch. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25.01.2016 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.03.2016 г. пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2016 г. і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» чытайце ў №238 газеты «Звязда» ад 09.12.2015 г.

Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.
ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 12.12.2015 ПА 31.03.2016.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2691 ад 07.12.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал 2016 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на I кв. 2016 года**

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

■ Гэта цікава

3D... ЧАСОЎ ПРАБАБУЛЬ

Карэспандэнт «Звязды» атрымаў унікальную магчымасць убачыць 3D-выявы так, як гэта рабілі ў дарэвалюцыйны час.
У спецыяльны апарат, выраблены ў XIX стагоддзі, устаўляеш «пласцінку» з парай фотаздымкаў. Адной рукой трымаеш апарат ля вачэй, а другой — аддаляеш і набліжаеш фота. І ў выніку гэтых «маніпуляцый» з'яўляецца стэрэавыява... Такім жа чынам забаўляліся і пазнавалі свет нашы продкі. Такія карцінкі да рэвалюцыі каштавалі прыкладна столькі ж, колькі сёння паштоўкі. І, зразумела, іх калекцыяніравалі, дарылі на святы, у тым ліку і на калядныя, навагоднія.

— Стэрэапара — спалучэнне дзвюх выяў аднаго і таго ж аб'екта з розных пунктаў. Адно фота або малюнак прызначаецца для левага вока, а другое — для правага. Такім чынам забяспечваецца магчымасць бінакулярнага (стэрэаскапічнага) прасторавага разгляду малюнка. Стэрэапары пры праглядзе ў стэрэаскоп ствараюць сапраўдную ілюзію аб'ёму знятага аб'екта. Яшчэ ў рукапісах Леанарда да Вінчы ёсць малюнкі і запісы па гэтай тэме, — распавядае **намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея па навуковай рабоце Валерый ШЫШАНАЎ.**

На мяжы XVI—XVII стагоддзяў італьянскі мастак Якопа дэ Эмполі стварае першую графічную працу са стэрэаэфектам, выкарыстоўваючы тэхніку парных малюнкаў.

У 1833 годзе англійскі фізік Чарльз Уітстан апублікаваў першыя стэрэаскапічныя карцінкі, якія можна было назіраць з дапамогай прылады для прагляду — стэрэаскопа.

З развіццём фатаграфіі стэрэаскапічныя здымкі атрымалі вельмі шырокае распаўсюджанне. З'явіліся стэрэаскопы самых розных сістэм. У 1856 годзе толькі ў Англіі прадалі больш за 1 мільён (!) апаратаў сістэмы Дэвіда Брустара. Лонданская кампанія па іх вытворчасці разгарнула рэкламную кампанію пад лозунгам «Ні аднаго дома без стэрэаскопа». І для гэтага прадавала апараты, танейшыя за 1 долар.

— Павальнае захапленне стэрэа пачалося ў сярэдзіне 1860-х гадоў і ахапіла Еўропу і ЗША. Былі выпушчаны сотні тысяч стэрэаграфічных пласцін з самымі рознымі сюжэтамі. Найбольшае распаўсюджванне атрымаў стэрэаскоп канструкцыі амерыканца Олівера Холмса. Яго вырабіў Джозэф Бэйтс з Бостана ў 1865 годзе. Холмс захапляўся стэрэафота і заклікаў з дапамогай стэрэаскопа «адправіцца ў падарожжа і быць гледачом усяго найлепшага, што мог прапанаваць свет». У выніку, сядзячы дома, можна было ўбачыць горы, акіяны, экзатычныя краіны, знакамітыя помнікі архітэктуры і гэтак далей, — працягвае Валерый Шышанаў.

У віцебскага музея ёсць нагода для гонару: у фонды паступілі ўнікальныя стэрэапары з відамі Віцебска канца XIX пачатку XX стагоддзя.

— Зразумела, што фота з відамі Віцебска для нас уяўляюць асаблівую цікавасць. Да нядаўняга часу ў фондах музея меліся толькі тры стэрэапары, звязаныя з Віцебскам. Яшчэ ў 1924 годзе ў фонд музея разам з архівам вядомага гісторыка і даследчыка Аляксея Сапунова паступіла стэрэапара з выявай раскопак на Замкавай гары (1895 год). У 1990-я музей атрымаў два фота членаў сям'і віцебскага архітэктара Ціхана Кібардзіна (1910-я гады). Некаторыя дамы, якія ён праектаваў, захаваліся да нашага часу... І вось зараз на інтэрнэт-аўкцыёне ў Польшчы музей набыў яшчэ дзевяць стэрэапар з відамі Віцебска. Яны датаваны 1900 годам. Сёння ў нас ёсць фота «Саборная плошча, Акруговы суд» (цяпер плошча Свабоды. — **Аўт.**), «Від на цэнтр горада з Духаўской гары», «Фантан ля чыгуначнага вакзала»; «Чыгуначны мост праз Дзвіну» і іншыя, — дзеліцца радасцю **Вольга ДАВЫДОЎСКАЯ, галоўны захавальнік фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.**

Пры дапамозе гэтага апарата можна зазірнуць у мінулае.

Вызначылі дакладна, што фота зрабіў вядомы фатограф Сігізмунд Юркоўскі. У 1866 годзе ён прыехаў у Віцебск. Праз год адкрыў фотаатэлье на Замкавай вуліцы. Сябраваў з мастаком І. Я. Рэпіным, фатаграфаваў самога мастака і яго дом. У архіве Расійскай акадэміі мастацтваў захавалася дзве стэрэапары, на якіх можна ўбачыць Рэпіна ў здраўнёўскай майстэрні («Здраўнёва» — маёнтак мастака недалёка ад Віцебска). Менавіта Юркоўскі ў 1882 годзе вынайшаў імгненны фатаграфічны затвор, а ў 1883 годзе — шторна-шчылінны, які стаў прататыпам затвораў сучасных фотаапаратаў.

Стэрэапара, зробленая ЮРКОЎСКІМ.

Адно з самых цікавых фота — «Барка на Дзвіне». Уявіце сабе, калісьці такіх суднаў па Заходняй Дзвіне праходзіла да 1,5 тысячы ў сезон. Памеры баркі ўражваюць і сёння: даўжыня — 38,5 метра, а шырыня — 12 метраў. На борце адразу маглі размясціць да 12 тысяч пудоў грузу. У жыхароў Віцебска была звычка бурна сустракаць баркі. Народ збіраўся на мосце (цяпер Кіраўскі мост. — **Аўт.**) і апладзіраваў рачнікам, вітаў іх крыкамі... Вельмі цікавая была традыцыя па продажы пернікаў з борта баркі. Іх дастаўлялі з расійскай Вязьмы. Пернікі прадавалі па 5-10 капеек, і гараджане высока цанілі іх якасць.

У планах віцебскіх музейшчыкаў — наладзіць супрацоўніцтва з выдавецтвам, каб рабіць сувенірныя наборы 3D. Адпаведныя можна купіць у Лондане, Парыжы і іншых мегаполісах. А чым Віцебск, дзе нарадзіліся і працавалі шмат вядомых людзей, горшы?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Фота аўтара

■ Спорт-тайм

ПЕРШАЯ ПЕРАМОГА НА СНЕЖНЫМ СХІЛЕ

Максім Гусцік выйграў этап Кубка свету па фрыстайле ў Пекіне, Надзея Скардзіна паказала найлепшы вынік сезона ў Паклюцы, а зборная краіны па хакеі заняла трэцяе месца на турніры ў Швейцарыі. Пра самыя актуальныя спартыўныя навіны спорту — у штотыднёвым аглядзе «Звязды».

1. У Пекіне завяршыўся этап Кубка свету па фрыстайле ў лыжнай акрабатыцы. Максім Гусцік у фінале спаборніцтваў змог абысці галоўнага канкурэнта — аўстралійца Дэвіда Морыса — і атрымаць перамогу.

У дзясятку наймацнейшых на кітайскім этапе Кубка свету ўвайшлі яшчэ два беларусы: Станіслаў Гладчанка (6-е месца) і Арцём Башлакоў (9-е месца).

У агульным заліку пасля двух пекінскіх этапаў у мужчын лідзіруе Дэвід Морыс — 140 ачкоў, другое месца ў Максіма Гусціка — 132 ачкі. Станіслаў Гладчанка размясціўся на 11-м месцы, Арцём Башлакоў займае 13-ю пазіцыю, Дзяніс Восіпаў — 18-ы. У жанчын першае месца ў агульным заліку ў амерыканкі Эшлі Колдуэл — 180 ачкоў. Беларуска Аляксандра Раманоўская займае 9-е месца, Ганна Гуськова — 11-е.

Наступныя этапы Кубка свету па фрыстайле ў лыжнай акрабатыцы пройдуць 5 лютага 2016 года ў амерыканскім Дзір Вейлі. 20 лютага будучага года перадапошні этап прыме спарткомплекс «Раўбічы».

2. Трэці этап Кубка свету па біятлоне ў славенскай Паклюцы завяршыўся гонкамі з масавага старту. Надзея Скардзіна не дапусціла ніводнага промаху на чатырох агнявых рубяжах і заняла пятае месца. А беларускія страляючыя лыжнікі не трапілі ў лік 30 удзельнікаў мужчынскага мас-старту.

Нагадаем, раней паступіла інфармацыі аб тым, што біятланісткі нашай нацыянальнай каманды пацярпелі ад віруснай інфекцыі ў Паклюцы.

— Спрынт беглі ўжо з тэмпературай — Пісарава, Дубарэзава, Крыўко. Пасля тэмпература паднялася да 38,5, а ўначы была рвота. Пісарава трапіла ў бальніцу ў Любляну. Крыўко атрымала дапамогу лекараў і ўсё ж такі выйшла на старт. Юркевіч прабегла, але на фінішы ўпала, яна таксама ў бальніцы. Уся каманда, па сутнасці, цяпер у нас хварэе. Мабыць, нейкі вірус у кішэчніку з такімі ж сімптомамі, як атручэнне, — адзначыў **галоўны трэнер каманды Уладзімір КАРАЛЬКЕВІЧ.**

Пасля выступлення ў Паклюцы біятланісты сыходзяць на калядныя канікулы. Чацвёрты этап Кубка свету адбудзецца 7-10 студзеня ў нямецкім Аберхофе.

3. Зборная Беларусі па хакеі заняла трэцяе месца на турніры Arosa Challenge ў Швейцарыі. У матчы за бронзавыя ўзнагароды падапечныя Дэйва Льюіса былі мацнейшыя за нарвежскіх хакеістаў 5:1, а днём раней прайгралі славакам 1:4.

— У нас было не шмат часу на падрыхтоўку да турніру. Самы важны вынік спаборніцтваў для трэнерскага штаба заключаецца ў тым, што мы ўбачылі, як маладыя хлопцы, якіх мы хацелі праверыць, паказалі сябе на высокім узроўні. Іх гульня спадабалася, і мы вельмі рады, што зараз яны адчуваюць сябе не проста хакеістамі з Беларусі, а гульцамі нацыянальнай зборнай, — адзначыў **Дэйв Льюіс.**

Пераможцам турніру Arosa Challenge стала каманда Швейцарыі, якая ў фінале перамагла сапернікаў са Славакіі ў серыі булітаў 3:2.

Нагадаем, для зборнай Беларусі міжнародны турнір у Швейцарыі стаў адным з этапаў падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, які ў маі 2016-га прымуць Санкт-Пецярбург і Масква. Наступны вучэбна-трэніровачны збор нацыянальнай каманды адбудзецца ў лютым.

4. У Мінску завяршыўся чэмпіянат Еўропы па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы, які праходзіў у сталічным Палацы спорту. Першае месца ў турніры заняў расіянін Вадзім Папоў: ён набраў 10 балаў з 11 магчымых. Другое месца ў Гранта Мелкумяна з Арменіі (9,5 ачка). На трэцюю прыступку п'едэстала гонару падняўся ўкраінец Вадзім Разін (9 ачкоў).

Сярод беларусаў самы высокі вынік у рапідзе паказаў Аляксей Фёдараў — 9-е месца, у бліцы — гросмайстар Сяргей Жыгалка, які набраў 16 ачкоў і размясціўся на 12-м месцы выніковага пратакола.

Адзначым, што мінскі чэмпіянат Еўропы па хуткіх шахматах і бліцы стаў самым буйным турнірам для гэтага віду спорту ў Беларусі за апошнія 15 гадоў. Спаборніцтвы ў Мінску наведаў кіраўнік міжнароднай шахматнай федэрацыі Кірсан Ілюмжынаў, а таксама прэзідэнт Еўрапейскага шахматнага саюза Зураб Азмайпарашвілі.

На чэмпіянат Еўропы ў сталіцу Беларусі прыехалі каля тысячы гульцоў з 31 краіны. Сярод іх — многія вядучыя шахматысты, якія ўваходзяць у першую сотню сусветнага рэйтынга.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ *lobazhevich@zviazda.by*

■ Самае-самае

ЛЕЦІШЧА ПАД МІНСКАМ ДЛЯ «РЭАЛЬНЫХ ПАЦАНОЎ»

Кампанія Google апублікавала найбольш папулярныя запыты беларусаў у інтэрнэце за 2015 год.

Самай цікавай для беларусаў тэмай стаў чэмпіянат свету па хакеі — 2015. Другое месца засталося за іншым міжнародным конкурсам — «Еўрабачаннем-2015». Астатнія месцы ў дзясятцы займаюць у асноўным фільмы і серыялы, гутарка пра якія пойдзе ніжэй. На апошнім месцы знаходзяцца курсы валют у Беларусі.

Найбольш папулярнымі персонамі для беларусаў сталі прадстаўнікі іншых краін. На першым і другім месцах — расійскія спявачкі: памерлая Жанна Фрыске і прадстаўніца Расіі на тым самым «Еўрабачанні» Паліна Гагарына. Першы ў спісе беларус замыкае тройку — гэта тэлевядучы Дзмітрый Шэпелеў. Беларуская ўладальніца Нобелеўскай прэміі Святлана Алексіевіч ідзе на чацвёртым месцы.

Пошукавік сцвярджае, што самым папулярным поўнаметражным фільмам стаў «Фарсаж-7». Адразу за ім — нашумелая карціна расійскага рэжысёра Андрэя Звягінцава «Левіяфан». «Бронзавы медаль» — у «Бітвы за Севастопаль». Астатнія кінастужкі — пераважна галівудскія: «50 адценняў шэрага», «Марсіянін», «Шалёны Макс», «Міньёны» і іншыя. Сярод серыялаў лідарства ўтрымліваюць расійскія «Кухня», «Закон каменных джунгляў» і «Рэальныя пацаны».

У спісе пакупак беларусаў сёлета самая папулярная рэч — бустар (варыянт дзіцячага аўтакрэсла). Не супраць нашы суайчыннікі і адпачыць у непасрэднай блізасці ад сталіцы — на другім месцы лецішча пад Мінскам. Ну а дабрацца на дачу дапаможа аўтамабіль, ён на трэцім радку. Акрамя гэтага, мы шукалі ў сеціве сабак пароды чыхуахуа, смартфон iPhone 6, рыбак, дзіцячыя ровары, шыны і садовыя арэлі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Ты марыш, каб назаўтра выпаў снег...
Снягі прыходзяць па сваіх законах —
Не вераць ні падзякам, ні праклёну.
Іх не расчуліць ні сляза, ні смех.

Але калі ад сцюжы рунь счарнее,
Рачулку заняволяць маразы —
Тады абрынуць з неба снегавеі,
Ратуючы палеткі і лясы.

Снег ратавальны, як Марыі покрыў.
Пад ім засне, перачакае край.
І будзе сніць буслоў, блакіт высокі,
Абуджаны цяплом вясновы гай.

Ты хочаш, каб назаўтра выпаў снег...
Павер, не варта падганяць прыроду:
Яна ў свой час дае адказ ці згоду
На ўсё, што звеку просіць чалавек.

■ Слова краязнаўцу

НАРОДНАЯ ПАЭЗІЯ БАГУШЭВІЧА

Адзін з лепшых гісторыкаў Лідчыны XX стагоддзя Міхал Шымялевіч пісаў у сваіх успамінах пра папулярнасць вершаў Францішка Багушэвіча ў Лідзе яшчэ да выдання яго кніг.

Пішучы пра аднаго з лідскіх старажылаў — Казіміра Вісманта на пачатку XX стагоддзя, гісторык паведаміў, што стары Казімір меў сына, якога ён вучыў на арганіста, і ажно чатыры дачкі. Да Казіміра Вісманта вечарамі хадзіла на вячоркі лідская моладзь, бо, зразумела, у доме тры дарослыя дачкі, і чацвёртая, Броня, ужо «ўбіваецца ў пёры». Моладзь гуляла ў гульні, распавядала ўсялякія цікавыя гісторыі, анекдоты, байкі, жахі, альбо пра чары і незвычайныя з'явы. Часам дэкламавалі «Легенду пра Кіёна, божага пакутніка» альбо такія вершы, як «Панскае ігрышча» ці «Адказ на панскае ігрышча» і іншыя, *«якія праз нейкі час былі надрукаваны ў Кракаве ў кніжачках Мацея Бурачка»*. З гэтых некалькіх радкоў вынікае, што вершы Францішка Багушэвіча мелі папулярнасць яшчэ да выдання яго кніжак, перапісваліся і чыталіся падчас вячорак.

Вядома, што Багушэвіч быў знаёмы з пісьменніцай Элізай Ажэшкай і наведваў яе ў Гродне. Ажэшка пісала ў пісьме да Яна Карловіча з Гродна 2 лістапада 1887 года: *«Тры тыдні таму быў у мяне добры Ваш знаёмы з Вільні п. Багушэвіч. Вельмі прыемна правяла я з ім некалькі гадзін. Ён мне чытаў сваю беларускую паэзію дый нават даў мне тэксты з асобным вершыкам, гэтаксама па-беларуску... Ці ж не праўда, што гэтыя рэчы вельмі харошыя, маюць нейкае асаблівае харство, і мяне вельмі цікавіць, ці здолеюць іх зразумець дый засмакаваць у іх нашыя сяляне? Будучым летам папрабую чытаць іх маім міневіцкім знаёмым»*.

Як бачым, напрыканцы 1887 года вершы Багушэвіча яшчэ невядомыя на радзіме і Эліза Ажэшка толькі плануе іх «пусціць у народ» — перадаць сялянам свайго маёнтка ў Мінявічах. А першая кніга паэта, «Дудка беларуская», выходзіць у Кракаве толькі ў 1891 годзе. Таму падзеі, якія апісвае Міхал Шымялевіч, можна датаваць — паміж 1888 і 1891 гадамі.

Важна адзначыць відавочнае «выбуховае» распаўсюджанне вершаў Багушэвіча: фактычна за некалькі гадоў вершы набываюць папулярнасць і пачынаюць жыць у беларускім народзе сваім жыццём. Такім чынам, мы бачым, што паэзія Багушэвіча была па-сапраўднаму народнай.

Леанід ЛАЎРЭШ

■ Беларусы замежжа

ТРЭЦІЯ ПА КОЛЬКАСЦІ

У Карэліі будзе створана адзіная культурна-асветніцкая аўтаномія беларусаў

Напрыканцы гэтага года адбыўся першы з'езд беларускай дыяспары ў Карэліі. Такую падзею можна лічыць знакавай, бо раней былі зроблены даследаванні і выдадзены кнігі па гісторыі ўкраінцаў, грузінаў у Карэліі; а пра беларусаў — не. І гэта пры тым, што беларуская дыяспара з'яўляецца найбуйнейшай у гэтым краі (пасля рускіх і саміх карэлаў). Пра тое, як трапілі беларусы ў Карэлію і што з гэтага атрымалася, карэспандэнту «Звязды» расказвала доктар гістарычных навук, прафесар БДУ Ірына КАЛАЧОВА — кіраўнік міжнароднага навукова-даследчага праекта па вывучэнні беларускай дыяспары ў Карэліі:

— Працэсы перасялення пачаліся яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны. Але сапраўдным пунктам адліку пераезду беларусаў у Карэлію сталі 1940—1950-я гады. Гэты далёкі край яшчэ заставаўся параўнальна свабодным ад прамысловасці, аднак там меліся багатыя прыродныя рэсурсы. У выніку савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг. Савецкаму Саюзу перайшоў Карэльскі перашыек і Прыладажжа — такім чынам змяніліся дзяржаўныя межы. У 1940 годзе быў выдадзены закон аб пераўтварэнні Карэльскай аўтаномнай сацыялістычнай рэспублікі ў Саюзную карэла-фінскую сацыялістычную рэспубліку. У Савецкага Саюза з'явілася новая тэрыторыя, вольная ад людзей: фінаў перасялілі на іх родную тэрыторыю, туды, дзе жыў тытульны этнас. Рабіліся заклікі да людзей з іншых савецкіх рэспублік, каб яны перасяляліся на гэтыя тэрыторыі. Беларусы пасля вайны, натуральна, жылі не вельмі багата, таму, пераязджаючы, разлічвалі, што іх жыццё неяк зменіцца ў лепшы бок. Праводзіліся рэкруцкія наборы, арганізавана набіраліся людзі для перасялення на тыя землі.

— Якім чынам адбывалася ўладкаванне на новым месцы жыхарства?

— Калі беларусы пераязджалі, то сяліліся асобнымі пасёлкамі — гэта давала магчымасць захаваць сваю культурную аднароднасць. Пражыванне такімі групамі — у пэўным сэнсе ахова сваёй унікальнасці. Аднак пасля сітуацыя стала мяняцца... Многія засяліліся ў вельмі добрыя дамы, пакінутыя фінамі. Тыя, каму ўдалося засяліцца ў іх, сталі жыць лепш. Аднак для іншых будаваліся баракі — фактычна, яны пачыналі жыць сярод лесу. Гэта было сапраўднае асваенне новых зямель.

— Наколькі добраахвотна беларусы перасяляліся ў Карэлію?

— З аднаго боку, гэта была дзяржаўная міграцыйная палітыка. З другога, і асабістае жаданне людзей. На сённяшні дзень ёсць звесткі, што 520 тысяч беларусаў жыве ў Расіі, з іх 23 тысячы — у Карэліі. Былі часы піка перасялення — пасля вайны, у 1950—1960-я гады. Аднак пачынаючы з 1970-х гадоў, многія пачалі вяртацца на радзіму, бо жыццё тут стала лепшым. Сёння беларусы — трэцяя па колькасці этнічная група, больш там толькі рускіх і карэлаў. Важнымі для таго, каб замацавацца, былі якасці беларусаў — працавітасць, добразычлівасць, добрасуседскае стаўленне да іншых, неканфліктнасць.

— Як думаеце, беларускі этнас там асіміляваўся ці захаваўся?

— Самае маштабнае даследаванне з гэтай нагоды праводзілася яшчэ ў 1979 годзе. Яно паказала, што працэс асіміляцыі досыць відавочны. Часта адбываліся шлюбы з прадстаўнікамі іншых народнасцяў. Таму цяпер з нашчадкаў тых беларусаў, якія калісьці перасяляліся ў Карэлію, толькі частка свядома адносіць сябе да нашага народу. Аднак многія даследчыкі, якія паз-ней вывучалі гэтую тэму, кажуць, што рысы прыналежнасці да беларускага этнасу ўсё-такі ёсць: пераймаюцца традыцыі народнай думкі, захоўваецца песенная культура — аднак пераважна сярод доўгажыхароў. Па-беларуску там ужо не размаўляюць, за выключэннем хіба што ўнутрысямейных стасункаў. Таму перад навукоўцамі стаіць задача вывучыць этнакультурныя працэсы і, вядома, даць адпаведныя рэкамендацыі кіруючым органам, адукацыйным і асветным установам. Бо сёння важна захаваць беларускую дыяспару, яе адметныя рысы, якія выяўляюцца на ўзроўні маўлення, чытання на беларускай мове і іншага.

На сённяшні дзень ёсць звесткі, што 520 тысяч беларусаў жыве ў Расіі, з іх 23 тысячы — у Карэліі.

— Якім чынам будзе ажыццяўляцца такая падтрымка?

— Было вырашана стварыць культурна-асветніцкую аўтаномію беларусаў у Карэліі — адзіную арганізацыю, замест разрозненых і малаколькасных. Яе маштабы досыць істотныя, аднак дзейнічае яна па прынцыпе абсалютнай добраахвотнасці.

— Быць можа, ужо позна ствараць такую арганізацыю? Калі мова не захавалася...

— Так, асіміляцыйныя працэсы выклікаюць пэўны сум, аднак гэта закранае многіх, не толькі беларусаў. Бо калі людзі мяняюць тэрыторыю пражывання, трапляюць у іншы асяродак, ён, натуральна, моцна ўплывае на іх. У пэўным сэнсе гэта адлюстроўвае негатыўны бок нашай самасвядомасці, калі людзі досыць хутка зліваюцца з іншымі. Аднак мы будзем працягваць працу па захаванні беларускага этнасу.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Кніга-гонар

ЯШЧЭ АДЗІН КАШТОЎНЫ СТАРАДРУК

У ПРЭЗІДЭНЦКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ПРЭЗЕНТАВАЛІ ТРЭЦІ СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, ВЫДАДЗЕНЫ Ў 1744 ГОДЗЕ. ЯГО ВЫКУПІЛІ Ў АДНАГА З ПОЛЬСКІХ КАЛЕКЦЫЯНЕРАЎ

Імя таго, каму асаблівым чынам трэба дзякаваць за падобны здабытак, — Андрэй Радкоў. Ён студэнт шостага курса гістарычнага факультэта БДУ. Увесь працэс — ад пошуку кнігі да дастаўкі ў Беларусь — заняў у Андрэя паўгода. У набыццё ён нават уклаў свае грошы, і толькі пасля таго, як кніга апынулася ў андрэевых руках, яна трапіла ў Прэзідэнцкую бібліятэку. Што цікава, гэта ўжо далёка не першы падобны годны ўчынак Радкова. Тры гады таму разам з Аляксеем Бацюковым, дырэктарам музея гісторыі Магілёва, і Дзмітрыем Яцкевічам, сённяшнім намеснікам дырэктара Нацыянальнага гістарычна-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», яны вярнулі Беларусі Статут ВКЛ 1588 года.



Фота Надзеі БУЖАН.

— Статут ВКЛ для нашай краіны — гэта працяг слаўнай традыцыі дзяржаўнасці на Беларусі, — кажа Андрэй Радкоў. — Гэтая кніга — помнік грамадска-палітычнай, прававой думкі. Кожны радок не проста быў узяты з галавы, а стагоддзямі ствараўся нашымі продкамі. Гэта той досвед грамадскага і палітычнага жыцця, які назапашваўся вякамі. Першы Статут прынялі ў 1529 годзе. Пасля была рэдакцыя 1566 года. Больш дасканалую версію зацвердзілі ў 1588 годзе. Гэты збор законаў дзейнічаў на нашых землях да сярэдзіны XIX стагоддзя. Кніга, якую я знайшоў, выдадзена ў Вільні, з'яўляецца польскамоўным перавыданнем апошняй рэдакцыі. Пад адной вокладкай сабралі некалькі заканадаўчых актаў. Гэтае выданне было даволі запатрабаванае.

— Але ў Беларусі захавалася зусім мала Статутаў.

— На жаль, так і ёсць. Амаль кожная буйная еўрапейская вайна рушыла праз нашу тэрыторыю. Праходзілі канфіскацыі, эвакуацыі, здараліся пажары... З-за гэтага мы шмат што страцілі. І цяпер прыходзіцца ўсё вяртаць, збіраць літаральна па крупінках. Што тычыцца арыгіналаў Статута ВКЛ, два з іх знаходзяцца ў Магілёве: адзін на старабеларускай мове, другі — на польскай. Ведаю, што яшчэ па адной кнізе ёсць у баранавіцкім і гарадзенскім музеях, Нацыянальнай бібліятэцы і цяпер у Прэзідэнцкай.

— Як ты наогул даведаўся пра гэтую кнігу?

— Сяргей Іванавіч Квачан, дырэктар бібліятэкі, папрасіў паспрыяць у пошуках Статута ВКЛ. Так сталася, што знайшоў выданне ў аднаго з гданьскіх калекцыянераў праз інтэрнэт. Каштавала яно каля 30 мільёнаў беларускіх рублёў. На ўсё ў нас пайшло паўгода. Цяжка пераацаніць дапамогу майго настаўніка і навукоўцы Дзмітрыя Яцкевіча, які выконваў ролю эксперта, а таксама прывёз фаліянт.

— Ці была небяспека, што мог з'явіцца перакупшчык, які дасць больш грошай?

— Так, крыху хваляваўся. Кніга знаходзілася ў вольным продажы, і яе маглі ў любы момант набыць. Ды і сама дарога з такой каштоўнай кнігай дае розныя падставы для хвалявання.

— Андрэй, а з чаго наогул распачаўся твой інтарэс?

— Я палову свайго жыцця марыў паступіць на гістарычны факультэт. Яшчэ падлеткам пазнаёміўся з выкладчыкамі БДУ. З таго часу многія сябры скончылі факультэт, але не пайшлі працаваць па прафесіі. А я заўжды думаў, што калі паступлю вучыцца на спецыяльнасць "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны", трэба нешта рабіць у гэтым кірунку. З першага курса я пачаў шукаць страчаныя кніжныя каштоўнасці. Першай маёй знаходкай стала метрыка ішкальдскага касцёла на лаціне, якую вялі з 1759 па 1807 год. Знайшоў яе на адным аўкцыёне, і мне стала прыкра, што такая кніга стала аб'ектам гандлю. Я зрабіў усё, каб арганізаваць яе выкуп. Дзякуй Богу, людзі дапамаглі. Ужо праз тыдзень яна знаходзілася ў руках даследчыкаў. Сёння яе можна ўбачыць у нацыянальным гістарычным архіве. З гэтай метрыкай звязаны цікавы выпадак. Ішкальдзь — вёска ў Баранавіцкім раёне — знаходзіцца непадалёк ад Вялікай Мядзведкі, малой радзімы славутага навукоўца, нацыянальнага героя Чылі Ігната Дамейкі. Ён нарадзіўся ў 1802 годзе, і як мне тады здалося, у Ішкальдзі яго маглі хрысціць. Я з нецярплівасцю пачаў шукаць запісы, датаваныя 1802 годам. І што вы думаеце?! Я знайшоў прозвішча "Дамейка", але пасля перакладу высветлілася, што ягоны бацька Іпаліт прысутнічаў тут на хрэсьбінах дзіцяці з сям'і Верашчакаў, яшчэ аднаго славутага нашага рода, а сам Ігнат Дамейка, відаць, быў ахрышчаны ў Паланэчцы.

— На Статуце ВКЛ, напэўна, твае пошукі не спыняюцца. Які цяпер твой арыенцір?

— Загадваць не буду. Наперад не ўгадаеш, што будзе пазней. І вельмі складана расставіць прыярытэты паміж кнігамі. Маўляў, тая нам больш патрэбна, а гэтая — менш. Усё, што датычыцца нашай спадчыны, праз пэўны час знікае. Для нас важна ўсё.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

P.S. *Што цікава, Статут ВКЛ — не адзіная старадаўняя кніга ў фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі, якая спецыялізуецца пераважна на прававой літаратуры. Як расказала «Звяздзе» Святлана Паўлавіцкая, супрацоўніца аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў бібліятэкі, самая старая кніга з фондаў бібліятэкі датуецца сярэдзінай XVI стагоддзя. Гэта юрыдычны дакумент, які сёння спатрэбіўся б натарыусу. Хапае ў тым ліку выданняў на лацінскай мове. Убачыць іх можна не толькі на выстаўках, якія пастаянна ладзяцца ў бібліятэцы, але і папрацаваць з імі ў чытальнай зале. Галоўнае — быць запісаным у бібліятэцы і мець чытацкі білет*

Сяргей КВАЧАН, дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі:

— Для нас, беларусаў, Статут ВКЛ — гэта найбольш значны помнік юрыдычнай думкі, літаратуры і, безумоўна, наш нацыянальны здабытак, які трэба старанна вывучаць, папулярызаваць. І менавіта на аснове падобных выданняў варта фарміраваць і выпрацоўваць у моладзі пачуццё самасвядомасці, патрыятызм, гонар за нашу краіну, яе гісторыю.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор аукционов: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288110101000134, площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Шапуры, ул. Шистерова, 12 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 25 945 900 бел. руб. **Размер задатка:** 2 594 000 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 26.01.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 22.12.2015 с 8.30 по 25.01.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка (начать строительство) не позднее 1 года со дня проведения аукциона; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314110126 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа – Октябрьский сельисполком

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220882719601000033, площадью 0,2499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друвеский с/с, д. Почта Ababье для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона особо охраняемых природных территорий (ГПУ «Национальный парк «Браславские озера»); водоохранная зона водного объекта (озеро Обабье). **Начальная цена**: 15 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 500 000 бел. руб.
Дата, время и место проведения повторного аукциона: 14.01.2016 в 15.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 22.12.2015 с 8.30 по 13.01.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни; 14.01.2016 с 11.00 до 13.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. **Условия аукциона:** разработать и утвердить ПСД на строительство объекта в срок не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем.участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2015. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312040003 ЦБУ №205 г. Браслав ф-л №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк код 150801660, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220888119101000166, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, д. Муражи, участок №45 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона особо охраняемых природных территорий (ГПУ «Национальный парк «Браславские озера»); водоохранная зона водного объекта (озеро Войсо). **Начальная цена**: 15 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 500 000 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 22.01.2016 в 14.15 по адресу: г. Браслав, ул.Советская, 119 в Браславском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 22.12.2015 с 8.30 по 21.01.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** разработать и утвердить ПСД и разрешение на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312080005 ЦБУ №205 г. Браслав ф-л №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, код 150801660, УНП 300594330, код платежа 04901. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
